Bielarus559c.qxd 7/31/2009 12:15 AM Page 3

*Жыве Беларусь!*

# БЕЛАРУС

Address: P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

BIELARUS/Belarusan newspaper in Free World ISSN 1054-9455
Published by the Belarusan American Association, Inc.

№ 559 Жнівень 2009 г.
Год выданьня 58

## Што я магу зрабіць для Беларусі?

Калі чалавека ня мае магчымасьці выказацца й быць пачутым, раз за разам, на сходах арганізацый, у яго застаецца адзінае выйсьце — напісаць артыкул. Натуральна, у гэтым ёсьць свае заганы: ня ўсе чытачы зьяўляюцца сябрамі тых арганізацыяў, ня ўсе ўважліва сочаць за падзеямі, ня ў курсе прынятых пастановаў; да таго-ж трэба імкнуцца пазьбягаць празьмернага ўдаваньня ў дэталі, а паспрабаваць ухапіць агульнае — тэндэнцыі, якія адбываюцца ў нашай грамадзе апошнім часам.

Дэмакратычнае грамадзтва тым і добрае, што беларусы за апошнія 50 гадоў стварылі ў ЗША некалькі арганізацыяў, якія плённа працавалі, нягледзячы на магчымыя разыходжаньні ў паглядах іхных кіраўнікоў. Сёньня сытуацыя зьмянілася кардынальна: спадар Вячка Станкевіч, фактычна другі чалавек у Радзе БНР, ачоліў і Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне і, на нядаўнім паседжаньні дырэктароў Фундацыі імя П. Крэчаўскага, самую Фундацыю.

Тут ня йдзецца пра асобу сп. Станкевіча, ведамага грамадзкага дзеяча, былога дырэктара Радыё Свабода, а выключна пра небясьпеку кіраваньня адною асобаю трыма найважнейшымі — палітычна, грамадзка й фінансава — арганізацыямі беларусаў у эміграцыі.

Сытуацыя непакоіць яшчэ і тым, што людзі, якія апошнія 10-15 гадоў працавалі на разьвіцьцё гэтых арганізацыяў, аддана і ахвярна, адпіхваюцца ўбок, як зрабіўшыя сваю справу, але цяпер непатрэбныя. Пры чым зьмена ўлады суправаджаецца непрыгожымі чуткамі, абвінавачваньнямі ў бок тых, хто за сваю шматгадовую працу заслужыўся толькі на пашану й падзяку.

У чым іхная правіннасьць, запытаецца чытач? Адказ просты: яны маюць уласную думку і пагляд, якія не заўсёды супадаюць з думкаю сп. В. Станкевіча. Газэта "Беларус" тым часам не падначаленая непасрэдна ні кіраўніцтву БАЗА, ні Радзе БНР, фінансава незалежная. У дыскусіях і спрэчках газэта дае магчымасьць выказвацца ўсім — незалежна ад іхных поглядаў. Гэта ейнае права, і ейны абавязак. Нягледзячы з паасобнымі дзеячамі Рады БНР — гэта ня ёсьць нязгода з самою Радаю БНР ці яе ідэаламі.

Некалі прэзыдэнт Джон Кенэды, зьвяртаючыся да суайчыньнікаў-амэрыканцаў, казаў: "..Мае земляікі-амэрыканцы, не пытайце, што вашая краіна можа зрабіць для вас — пытайце, што вы можаце зрабіць для вашай краіны." Тады малады прэзыдэнт даў новую ўпэўненасьць амэрыканцам у сваёй краіне, яе магчымасьцях, даў штуршок для разьвіцьця грамадзтва, для падтрымкі ідэалаў свабоды і дэмакратыі, на якіх заснаваная і збудаваная Амэрыка.

Чалавецтва заўсёды дзялілася на ідэалістаў і прагматыкаў, і той заклік быў успрыняты ня ўсімі аднолькава. Але ён запаў у сэрцы і застаўся ў памяці. Словы Кенэды як найлепш стасуюцца і да беларускай справы. Тысячы ахвярных беларусаў тут, на эміграцыі, пакінулі памяць па сябе, ахвярна працуючы і будуючы грамадзкія арганізацыі, цэрквы, беручы ўдзел у выдавецкай дзейнасьці, даводзячы да амэрыканскага грамадзтва інфармацыю аб Беларусі, дапамагаючы далёкай Бацькаўшчыне скінуць хамут расейскай камуністычнай тыраніі. І гэтыя людзі пыталіся сябе: "Што я магу зрабіць для беларускай справы?", знаходзілі адказ — і рабілі.

Нажаль, сёньня памалу распаўсюджваецца іншы падыход. "Што беларуская справа можа зрабіць для мяне? Зь якога боку падступіць да яе, каб я мог жыць лепей?" І тут знаходзіцца адказ, і тут праводзіцца дзейнасьць. Але вынік яе — не будаваньне, а руйнаваньне таго, што існавала дасюль, канцэнтрацыя ў адных руках розных пасадаў, каб уплываць на людзей, маніпуляваць іх настроямі на сваю карысьць. Падзеі апошніх месяцаў паказваюць, што ідэалістаў у беларускай справе выцiскаюць на маргінэс, а тыя, хто гатовыя трактаваць беларускую справу як сродак для паляпшэньня ўласнага жыцьця і як справу закрытага, абмежаванага кола прыхільнікаў — набіраюць падтрымку людзей, якія не заўсёды здольныя бачыць і аналізаваць магчымыя наступствы такіх зьменаў.

Хочацца нагадаць нашым паважаным кіраўнікам, што беларуская справа заўсёды трымалася на ідэалізме і ахвярнасьці, і дзякуючы гэтаму мы маем сёньня тое, што маем. Калі-ж у беларускай грамадзкай дзейнасьці пачыналі кіравацца законамі, па якіх працуюць у бізнэс-карпарацыях, калі матэрыяльная зацікаўленасьць пераважала духоўную, то справа ў рэшце рэшт зыходзіла на нішто і замірала. Галоўная нашая каштоўнасьць — нашыя ахвярныя людзі, каму баліць душа за Беларусь, а ня тыя, хто заўжды пагаджаецца з вамі. Цаніце вашых апанэнтаў за іхнюю нязгоду нават у тых выпадках, калі яны, здавалася-б, перашкаджаюць у рэалізацыі нейкіх амбітных плянаў, бо гэта засьцеражэ вас ад прыкрых памылак, якіх вы можа яшчэ ня бачыце.

## Тыдзень Паняволеных Народаў у Нью-Ёрку




Беларуская грамада Нью-Ёрку і ваколіцаў 19 ліпеня прыняла ўдзел у адкрыцьці Тыдня Паняволеных Народаў, які праводзіцца Камітэтам Паняволеных Народаў і традыцыйна адбываецца на трэцім тыдні ліпеня згодна з законам Кангрэсу ЗША, прынятым 50 год таму. Імпрэзы Тыдню заўсёды пачынаюцца з Маршу Паняволеных Народаў.

Закон аб Тыдні Паняволеных Народаў быў зацьверджаны ў часы расейскай камуністычнай дамінацыі ў краінах Усходняй Эўропы, у тым ліку ў Беларусі. Імпрэза была прызначаная прыцягваць увагу амэрыканскага грамадзтва і ўраду да стану народаў, паняволеных савецкім таталітарызмам, а таксама любой іншай тыраніяй у цэлым сьвеце. Штогод Маршы Паняволеных Народаў зьбіралі дзясяткі тысяч удзельнікаў. Так, у 1983 годзе была найбольшая колькасьць — 23 тысячы чалавек. Беларусы бралі і дасюль біруць самы актыўны ўдзел у Маршах і мерапрыемствах Тыдню Паняволеных Народаў.

У 1989-91 гг. большасьць народаў Эўропы вызвалілася ад расейскага камунізму. Беларусь атрымала незалежнасьць, але з 1994 году нэасавецкая сыстэма была рэстаўраваная. Беларусы Нью-Ёрку дзеля гэтага працягваюць лічыць свой народ паняволеным і біруць удзел у імпрэзах Тыдня. За гэты час беларускія ўдзельнікі зрабіліся асноўнай часткай дэманстрантаў падчас Маршу Паняволеных Народаў, і нацыянальныя беларускія бел-чырвона-белыя сьцягі ўжо доўгі час дамінуюць на гэтай імпрэзе.

Марш пачаўся, як заўсёды, ад гатэлю Пляза на 59-й вуліцы. Дэманстранты прайшлі па Пятай Авэню да Катэдры сьв. Патрыка, дзе адбылося асьвячэньне сьцягоў і імша за паняволеныя народы, якую правіў нядаўна прызначаны арцыбіскуп Нью-Ёрку Тымаці Долан. Затым удзельнікі прайшлі маршам па Пятай Авэню да 72-й вуліцы. Гранд-маршалам Маршу быў прадстаўнік БАЗА сп. В. Зайка. На сонцы луналі бел-чырвона-белыя сьцягі, дэманстранты несьлі расьцяжкі і плякаты. Раз-пораз гучэла "Жыве Беларусь!". У імпрэзе бралі ўдзел таксама прадстаўнікі Кубы, Эстоніі, нямецкіх усходніх земляў.

У Цэнтральным парку адбылося афіцыйнае адкрыцьцё Тыдня. Старшыня Камітэту Паняволеных Народаў Х. Уліх прачытаў прывітаньні ад мэра Нью-Ёрку і прэзыдэнта ЗША. Затым з прамовамі выступілі сп. В. Зайка, прадстаўнік Камітэту Паняволеных Народаў у Вашынгтоне Ў. Раян, прадстаўнік Таварыства Піюса Х Дж. Сьміт. Удзельнікі Маршу прынялі рэзалюцыю, у якой, у прыватнасьці, выказваецца патрабаваньне да ўраду ЗША настойлівей і пасьлядоўней дапамагаць аднаўленьню дэмакратыі і сапраўднай незалежнасьці ў Беларусі.

**Віталь ЗАЙКА**

## Чаму ў 1994 годзе на прэзыдэнцкіх выбарах перамог Лукашэнка?

Запыты такога роду заўсёды выглядаюць трохі дзіўнымі сваёй пастаноўкай наіўнасьцю. Скажам: "Чаму ў культурнай Нямеччыне да ўлады прыйшоў Гітлер?" Ці: "Чаму расейскія камуністы праводзілі генацыд народаў за савецкай уладай?" Але, тым ня менш, гэта ёсьць самае ўнівэрсальнае пытаньне, каб адказаць па сутнасьці. Спынюся толькі на асноўных тэзісах.

**1.** Перамагчы павінен быў Народны Фронт. Дзеля гэтага была падрыхтаваная палітычная база. У канцы 1992 году, пасьля антызаконнай забароны рэфэрэндуму аб новых парлямэнцкіх выбарах, Апазыцыя БНФ у Вярхоўным Савеце паставіла задачу дамагчыся адстаўкі ўраду Кебіча. Увесь цяжар працы дэпутацкай Апазыцыі БНФ быў перанесены на электарат. Былі наладжаныя пастаянныя паездкі дэпутатаў БНФ па Беларусі, адбыліся сотні спатканьняў з выбаршчыкамі пры перапоўненых залях. Газэта "Сва-

*Заканчэньне на бачыне 8*

Bielarus559c.qxd 7/31/2009 12:15 AM Page 4



# Фундацыі Крэчэўскага - 50 гадоў

Сёлета 2 чэрвеня споўнілася 50 гадоў ад дня заснаваньня шырока вядомай ў беларускім замежжы Фундацыі імя Пётры Крэчэўскага. Сярод сяброў-заснавальнікаў былі вядомыя асобы: Вітаўт Тумаш, Антон Адамовіч, Кастусь Мярляк, Антон Шукелойць і Янка Запруднік. Першым старшынём быў абраны Вітаўт Тумаш.

Галоўнаю мэтаю Фундацыі было вызначана захаваньне ў ЗША беларускай гісторыі і культурных традыцый і стварэньне з гэтай мэтаю архіву-музэя. Арганізацыя павінна была стаць беларускім навукова-культурным цэнтрам у Нью-Ёрку. Ад самага пачатку яна працавала пад патранатам Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. Па гэтай прычыне Фундацыя атрымала імя аднаго з прэзыдэнтаў Рады БНР Пётры Крэчэўскага, які займаў гэтую пасаду да 1928 году, калі Рада БНР знаходзілася ў Празе.

Менавіта Фундацыі Рада БНР даручыла выконваць асабліва важную ролю па захаваньню духоўных набыткаў беларускай эміграцыі. У красавіку 1960 году па даручэньню Рады БНР Фундацыі былі перададзеныя фінансавыя сродкі на набыцьцё будынка і заснаваньне там Беларускага архіву-музэя. 1 ліпеня таго-ж году была падпісаная адмысловая дамова між Фундацыяй і Радаю БНР аб тым, што перададзеныя сродкі будуць выкарыстаныя на стварэньне архіву-музэя і што ўся далейшая праца па выкананьню гэтага пляну будзе ўзгадняцца з Радаю БНР, было падкрэслена, што набытая за гэтыя сродкі маёмасьць Фундацыі будзе лічыцца ўласнасьцю Рады БНР.

Гэтым крокам Рада БНР як-бы аднаўляла дзейнасьць Беларускага заграніччнага архіву, які быў створаны ёю ў Празе і дзейнічаў там да акупацыі Чэхаславаччыны гітлераўцамі ў 1939 годзе.

14 сьнежня 1964 году прадстаўнікі Фундацыі падпісалі акт пакупкі чатырох дамоў у Куіньсе на вул. Готык Драйв у Джамэйцы. Зь іх цяпер ва ўласнасьці застаўся толькі адзін. На жаль, утрымаць астатнія не атрымалася па розных паважных прычынах, і яны па некаторым часе былі прададзеныя.

Згодна з дамовай з Радаю БНР, Фундацыя займалася зборам архіваў і бібліятэкі ў набытых памяшканьнях. Але, матэрыялы гэтыя так і заставаліся неўпарадкаванымі. Як структурная адзінка архіўмузэй так і ня быў створаны. Дзейнасьць Фундацыі паступова скіравалася да культурна-асьветнай працы і падтрымкі выданьня беларускіх кнігаў у замежжы. За увесь час свайго існаваньня Фундацыя падтрымала фінансава выданьне каля 40 кнігаў.

Калі пачаліся сталыя кантакты эміграцыі зь беларусамі з Бацькаўшчыны, Фундацыя аказвала фінансавую падтрымку культурным праектам у Беларусі, яе дапамогу атрымлівалі і новыя беларускія эмігранты, якія зьявіліся ў ЗША пасьля ўсталяваньня дыктатуры Лукашэнкі. Памяшканьнямі Фундацыі карысталіся для сваёй працы іншыя беларускія арганізацыі ў Амэрыцы, гэтак адбываецца і да сёньня.

Паўтары гады таму Рада БНР прыняла пастанову аб непасрэдным стварэньні ў будынку Фундацыі Беларускага замежнага архіву, які будзе зьбіраць і захоўваць матэрыялы па гісторыі беларускай эміграцыі. Цяпер ідзе падрыхтоўчая праца, каб стварыць адпаведныя ўмовы для працы архіву.

21 чэрвеня сёлета адбыўся гадавы справаздачна-выбарчы сход сяброў Фундацыі. На ім шырока абмяркоўваліся бліжэйшыя пляны дзейнасьці. Акрамя стварэньня архіву, асноўнымі накірункамі дзейнасьці будзе адпаведны дагляд за маёмасьцю і працяг выдзяленьня грантаў на розныя навуковыя і культурныя праекты.

На сходзе была абраная новая Рада дырэктараў у складзе: Вячка Станкевіч – старшыня, Алла Орса-Романо – адказны сакратар, Вітаўт Кіпель – куратар архіву, Ганна Сурмач – архівіст, пратакольны сакратар, Валеры Дворнік – скарбнік, Сяргей Пятровіч – гаспадарчыя справы. Рэвізорам была абраная Ала Кузьміцкая. Дзеля апэратыўнейшай дзейнасьці былі створаныя працоўныя структуры па вызначаных асноўных накірунках дзейнасьці – архіўная, гаспадарчая і грантавая.

Фундацыя зьяўляецца ўстановаю, якая апрача дырэктараў, мае і сяброў – людзей, якія цікавяцца еймымі мэтамі і гатовыя ўдзельнічаць у яе дзейнасьці. Яны і выбіраюць Раду дырэктараў на гадавых сходах. Кожны, хто пажадае далучыцца да працы Фундацыі, можа зьвярнуцца з заяваю на адрас Рады дырэктараў. Гэта могуць быць навукоўцы, студэнты гуманітарных навук на беларускія тэмы, а таксама і іншыя людзі, якія сваёю працаю будуць падтрымоўваць дзейнасьць Фундацыі.

Таксама запрашаем беларускія арганізацыі ў замежжы і асобы перадаваць свае дакумэнты, бібліятэкі, музэйныя экспанаты ў створаны архіў-музэй.

Спадзяемся, што Фундацыя ў поўным сэнсе стане Беларускім навукова-культурным цэнтрам у Нью-Ёрку і такім чынам апраўдае тыя спадзяваньні, якія былі ўскладзеныя на яе 50 гадоў таму.

***Ганна СУРМАЧ***

# Новы кіраўнік дыпмісіі



Амэрыканскую дыпмісію ў Менску ўзначаліць Майкл Скэнлен. Ён прыбыў у Беларусь 30 чэрвеня. 1 ліпеня дыпламат быў прадстаўлены цяперашнім часовым паверaным у справах ЗША ў Беларусі на прыёме ў рэзыдэнцыі амбасадара ЗША ў Раўбічах у гонар Дня незалежнасьці ЗША 4 ліпеня.

Абавязкі кіраўніка амэрыканскай дыпмісіі ён пачаў выконваць пасьля 7 ліпеня, калі Беларусь пакінуў ягоны папярэднік Джонатан Мур. Майкл Скэнлен — кар'ерны дыплямат, яму 48 гадоў, ён нарадзіўся ў Вашынгтоне, займаў пасады ў дыпмісіях ЗША ва Украіне, Казастане, Кыргызстане, Расеі і на Балканах. Да прызначэньня ў Беларусь працаваў у Кіеве.

У 1984 годзе Майкл Скэнлен атрымаў ступень бакаляўра ў школе замежных справаў Джорджтаўнскага ўнівэрсытэту, а ў 1989 годзе – ступень магістра міжнародных зносінаў у школе права і дыпляматыі ўнівэрсытэту Тафтс.

Валодае расейскай, сэрбскай мовамі, вывучае беларускую.

***Паводле Радыё Свабода***

# Беларуса асудзілі на 7 гадоў



У штаце Вірджынія 17 ліпеня 2009 году фэдэральны судзьдзя прыгаварыў выхадца зь Беларусі Віктара Курса да 7 гадоў зьняволеньня за стварэньне і кіраваньне нелегальнай арганізацыяй, якая пастаўляла танных працаўнікоў для гатэляў і чыгуначных прадпрыемстваў на усходнім ўзьбярэжжы ЗША. Па гэтай справе былі прызнаныя вінаватымі 22 асобы.

Віктар Курс прыехаў у Злучаныя Штаты па студэнцкай візе у сакавіку 2001 году і адразу папрасіў палітычны прытулак, заявіўшы, што быў перасьледаваны ў Беларусі як сябра студэнцкай арганізацыі "Зубр".

Злачынная арганізацыя, створаная Курсам, спрыяла шмат якім беларусам у атрыманьні палітычнага прытулку, даючы ім падробныя дакумэнты, якія пацьвярджалі, што беларускі ўрад перасьледаваў іх за палітычную дзейнасьць. Абвінавачаныя таксама перапраўлялі ў краіну работнікаў, запаўняючы пэтыцыі на сваякоў, выраблаючы несапраўдныя гасьцявыя запрашэньні і арганізоўваючы фіктыўныя шлюбы.

Імігранты, прывезеныя такім чынам, вымушаныя былі жыць па 12-15 чалавек на адной кватэры, і Курс утрымліваў з іхняга $7 на гадзіну заробку выдаткі на ўніформу, транспарт, пражываньне і г. д. У той самы час ён дамаўляўся, што працадаўцы плацілі яму $10 на гадзіну за кожнага працаўніка. Так, ён зарабляў $3 на гадзіну за кожнага чалавека ў дадатак да таго, што ён утрымліваў з заробкаў. Такім чынам ад 2003 году 28-гадовы Курс зарабіў прыкладна 34 мільёны даляраў і прывёз у краіну больш за 3800 імігрантаў, пераважна з Усходняй Эўропы.

Пасьля адбыцьця 87-месячнага прысуду Курс будзе дэпартаваны ў Беларусь. Застаецца няясным, ці зьменіць гэтая судовая справа прыхільныя адносіны амэрыканскіх уладаў да беларусаў, якія шукаюць палітычнага прытулку.

***Паводле bielar.us***

# Купальле ў Забайкальлі

У ноч з 27 на 28 чэрвеня беларусы Прыбайкальля адзначылі Купальле – без сумніву, самую яркую падзею году. Арганізатарам сьвята ўжо трынаццаты год запар выступае Іркуцкае Таварыства Беларускай Культуры імя Яна Чэрскага. Нажаль, сёлета на сьвяце не было Алега Рудакова, старшыні ІТБК, ён у гэты час знаходзіўся ў Беларусі. Усе арганізацыйныя пытаньні вырашала гарадзкая рада ІТБК на чале з Аленай Сіпаковай.

Сьвята адбылося ў маляўнічай мясьціне на беразе ракі Олхі. Нягледзячы на зацягнутае хмарамі неба, сабралася больш за 80 чалавек.

Сёлета сцэнар быў узбагачаны мноствам цікавых дэталяў. Напрыклад, было паказанае захапляючае вогненны выступ у выкананьні Яны Максімавай. Яна, ціхая і сьціплая дзяўчына, на Купальле стала таемнаю істотаю, якая размахвала агнямі, выпісваючы з паветры васьмёркі. Для бальшыні такое відовішча было ў навіну, ну і ніхто нават і не падазраваў, што Яна мае такое гобі...

Сёлета ўпершыню да Купальля далучыліся хлопцы з клюбу "Вольнае племя". Яны займаюцца адраджэньнем старажытных славянскіх традыцый, выраблюць старажытныя дасьпехі і зброю. На сьвяце Купальля яны зьявіўся ў выглядзе выхадцаў зь пекла, прадстаўнікоў нячыстай сілы.

Потым адбыўся двубой славянскага воя з "Вольнага племені" і заходнеэўрапейскага рыцара з "Мальтыйскага ордэну". Абодва былі закаваныя ў латы і зрабілі на публіку вялікае ўражаньне.

У канцы сьвята, калі многіх ужо хіліла на сон, усіх рахварушылі русалкі, на ролю якіх запрасілі дзяўчат, якія прафэсійна займаюцца танцамі. Яны паказалі сваё мастацтва, а потым апырскалі ўсіх вадою, так што спаць ужо не хацелася.

Увогуле сьвята прайшло, як заўсёды, весела і вельмі цікава.





***Аляксей ЯРМОШКІН***

Bielarus559c.qxd 7/31/2009 12:15 AM Page 5



# Беларусь за месяц

## Зьезд беларусаў сьвету

18—19 ліпеня ў Менску, у памешканьні Міжнароднага адукацыйнага цэнтру, прайшоў V Зьезд беларусаў сьвету. У працы форуму ўзялі ўдзел 252 дэлегаты (былі вылучаныя 308), якія прадстаўлялі 18 краін сьвету. Натуральна, што найболей было дэлегатаў ад Беларусі – 126 чалавек, ад Расеі – 44, Польшчы – 22, Летувы – 21, Украіны – 8, Брытаніі – 6, ЗША – 4, Бэльгіі – 2, Канады – 1. Былі вылучаныя, але не прыехалі на зьезд, дэлегаты з Казахстану, краін Сярэдняй Азіі, Закаўказьзя, затое былі прадстаўнікі Новай Зэляндыі, Італіі, Турцыі. Трывожны званочак прагучаў з Аўстраліі, адкуль не былі дэлегатаў зусім.



На форум таксама прыйшлі прадстаўнікоў беларускіх уладаў: міністар культуры Павал Латушка, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў Леанід Гуляка, чыноўнікі міністэрства замежных спраў і міністэрства адукацыі, намесьнік міністра эканомікі Андрэй Тур. Зьезд у поўным аб'ёме, хоць і цераз прызму сваіх акуляраў, асьвятлялі галоўныя беларускія дзяржаўныя СМІ.

Павал Латушка і Леанід Гуляка выступілі перад удзельнікамі зьезду з прамовамі, прычым на вельмі добрай беларускай мове. Зрэшты, усе прадстаўнікі дзяржорганаў выступалі па-беларуску, прычым мова з іхных вуснаў гучала натуральна.

Старшыня Згуртаваньня беларусаў сьвету "Бацькаўшчына" Алесь Марачкін у сваім выступе досыць змрочна ацаніў стан сучаснай беларускай культуры і прапанаваў вярнуць беларускай мове статус адзінай дзяржаўнай. Гісторык Натальля Гардзіенка спынілася на асноўных праблемах сучаснага беларускага замежжа ды ацаніла колькасьць суайчыньнікаў за мяжой: гэта 2,5—3,5 млн чалавек. Цяпер наймацнейшая беларуская дыяспара пражывае ў Расеі. Янка Запруднік (ЗША) распавёў пра праблемы, зь якімі сутыкаецца сёньня беларуская дыяспара за акіянам. А Алег Рудакоў расказаў пра сытуацыю ў Іркуцку, дзе толькі паводле афіцыйных зьвестак налічваецца 50 тысяч нашых суайчыньнікаў. Зьбольшага гэта нашчадкі эмігрантаў пачатку XX ст., што выехалі ў Сібір у выніку сталыпінскай рэформы. Алег Рудакоў прапанаваў у найбліжэйшы час адзначыць круглую дату гэтага перасяленьня, пік якога прыйшоўся акурат на 1909—1910 гады. У першы дзень працы зьезду выступалі дэлегаты форуму, а таксама ўдзельнікі зьезду працавалі ў сэкцыях.

Другі дзень пачаўся з сустрэчы дэлегатаў з прадстаўнікамі ўлады. Павал Латушка, Леанід Гуляка, Уладзімер Шчасны ды Андрэй Тур адказвалі на самыя нават няёмкія пытаньні. Адбылася таксама прэзэнтацыя новых выданьняў, якія выйшлі пры падтрымцы ЗБС "Бацькаўшчына", у тым ліку і фундамэнтальнага даведніка Міколы Нікалаева "Беларускі Пецярбург". Пры канцы другога рабочага дня было прынятыя выніковых рэзалюцый, у тым ліку пра неабходнасьць стварэньня для беларусаў замежжа карты беларуса ды прыняцьця закону пра суайчыньнікаў за мяжой.

Кульмінацыяй зьезду сталі выбары кіраўніцтва. На пасаду старшыні Згуртаваньня на безальтэрнатыўнай аснове была вылучаная Алена Макоўская, старшынём Рады была абраная яе колішняя намесьніца Ніна Шыдлоўская.

Пасьля ў інтэрв'ю "Нашай Ніве" Алена Макоўская наступным чынам ацаніла вынікі зьезду: "Бацькаўшчына" вельмі доўгі час апэлявала да ўладаў у пляне вырашэньня пытаньняў беларускай дыяспары. Я лічу лягічным і заканамерным, што мы нарэшце былі пачутыя, і да нас прыйшоў міністар культуры, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў. Мы спадзяемся, што накont тых пытаньняў, якія былі агучаныя на зьездзе, будуць прынятыя канструктыўныя рашэньні".

Якія найбліжэйшыя задачы? "Першасная задача – выконваць прынятую праграму зьезду. Таксама гэта праца адносна прыняцьця Закону "Аб беларусах замежжа". Працы вельмі багата, і шмат дзе мы будзем зьвяртацца да прадстаўнікоў улады, бо бязь іх станоўчых адказаў немагчымае вырашэньне праблем", – сказала Алена Макоўская.

## Справаводства па-беларуску

Міністар культуры Павал Латушка, адказваючы на пытаньні дэлегатаў V Зьезду беларусаў сьвету, заявіў, што Міністэрства культуры пераводзіць справаводства на беларускую мову. Паводле слоў міністра, асабіста для яго "беларуская мова зьяўляецца прыярытэтнай". "У асноўным у Міністэрстве культуры мы будзем весьці справаводства на беларускай мове і, такім чынам, пастараемся падаваць прыклад астатнім міністэрствам і ведамствам", – сказаў ён.

Павал Латушка быў прызначаны на пасаду міністра культуры 4 чэрвеня ўказам прэзыдэнта. Дагэтуль ён займаў пасаду пасла Беларусі ў Польшчы.

## Вінавацць у тэрарызме

92 дні, з 16 красавіка па 16 ліпеня, галадаў у менскім сьледчым ізалятары ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч. За гэты час ён моцна падарваў сваё здароўе, страціўшы 35 кг вагі. Прадпрымальнік патрабаваў або перадаць справу ў суд, або зьмякчыць меру стрымданьня з утрыманьня пад вартай на падпіску аб нявыезьдзе. Галадоўка, як бачым ні да чага не прывяла.

Аўтуховіч спыніў галадоўку на просьбу адваката Паўла Сапелкі. "Справа падышла да такога моманту, калі трэба знаёміцца са справай ды выпрацоўваць пазыцыю абароны. У галадаючым стане гэтага зрабіць немагчыма", – сказаў журналістам адвакат. 17 ліпеня Аўтуховічу выставілі абвінавачаньне ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акту.



Сьледства ўстанавіла, што Аўтуховіч рыхтаваўся да фізычнай ліквідацыі старшыні Гарадзенскага аблвыканаму Ўладзімера Саўчанкі з "мэтаю аказаньня ўздзеяньня на рашэньні, што прымаюцца дзяржорганамі, а таксама з-за помсты". Таксама сьледства сьцьвярджае, што Аўтуховіч з "іншымі асобамі" рыхтаваў замах на жыцьцё намесьніка міністра па падатках і зборах Камянко.

Мікалай Аўтуховіч і яшчэ два актывісты прадпрымальніцкага руху з Ваўкавыску – Юры Лявонаў і Ўладзімер Асіпенка – былі затрыманыя 8 лютага з санкцыі пракурора Гарадзенскай вобласьці і зьмешчаныя ў менскі сьледчы ізалятар. 18 лютага ім было выстаўлена абвінавачаньне "наўмыснае зьнішчэньне або пашкоджанне маёмасьці".

## Штраф у $11 000



Віцебскі абласны суд пакараў 16 ліпеня праваабаронцу Леаніда Сьвеціка штрафам у памеры 900 базавых велічыняў. Гэта 31 мільён 500 тысяч беларускіх рублёў ці больш за $11 000. Таксама Сьвецік абавязаны кампэнсаваць маральны ўрон старшыні віцебскай філіі Саюзу пісьменьнікаў Тамары Красновай-Гусачэнцы ў 1 мільён рублёў. Праваабаронцу абвінавацілі ў тым, што ён дасылаў лісты з пагрозамі віцебскім апазыцыянерам ад імя "Русского национального единства". Гэта артыкул 130 КК "Распальванне нацыянальнай і расавай варажнечы", і пракурор патрабаваў два гады калёніі.

## Жорсткі прысуд Дубскаму

Годам калёніі пакараў 7 ліпеня Асіповіцкі раённы суд (Магілёўская вобл.) Арцёма Дубскага. Хлопца асудзілі паводле артыкула 415 КК "Парушэньне правілаў адбываньня пакараньня ў выглядзе абмежаваньня волі". Арцём быў адным з фігурантаў "Працэсу 14-ці", і ясной 2008 г. быў асуджаны на два гады "хатняй хіміі". Мінулай восеньню пасьля ціску з боку міліцыі і спэцслужбаў ён мусіў выехаць ва Ўкраіну.

У лютым 2009 г. Арцёма затрымалі на мяжы, калі хлопец ехаў у Менск на моладзёвую акцыю. Два месяцы маладафронтавец правёў у асіповіцкім і бабруйскім ізалятарах, але перад пачаткам праграмы "Ўсходняе партнэрства" быў выпушчаны з турмы. Амаль адразу па вызваленьні Арцём вярнуўся да актыўнай дзейнасьці (узяў удзел у галадоўцы салідарнасьці з Аўтуховічам), і праз некаторы час справу супраць яго аднавілі.

20 ліпеня Арцём абвясьціў галадоўку пратэсту ў адказ на ўмовы, якія яму ствараюць у сьледчым ізалятары Бабруйску, напрыклад, забараняюць прымаць неабходныя лекі ды прымушаюць напісаць заяву аб прымусовым пераводзе ў калёнію, што нават забаронена заканадаўствам.

## Чаргінец: Быкаў пісаў вершы

Пра гэта заявіў на прэс-канфэрэнцыі ў Менску старшыня праўладнага Саюзу пісьменьнікаў Мікалай Чаргінец: "З Быкавым я сябраваў і я шанаваў гэтае сяброўства. Шчыра кажучы, калі я быў у Аўганістане, акрамя Быкава ніхто столькі не напісаў мне лістоў. (...) Быкаў заўсёды быў зь дзяржавай. Але былі ў іх і непаразуменьні. Выклікалі яго прадстаўнікі пэўных службаў. Я памятаю, як ён распавядаў мне з болем у душы, ледзь ня плачучы ад крыўды. Сапляк нейкі паклікаў, і кажа ну-ка пакажы, дзе Магадан на карце знаходзіцца. (...) Памятаеце як кпілі, Лукашэнка сказаў, што Быкаў вершы піша. Пачалі выкідваць пасквілі і грязь. Насамрэч Быкаў пісаў вершы. Пісаў, родная сястра аб гэтым пацьвердзіла».

На той-жа прэс-канфэрэнцыі Чаргінец сказаў, што дзякуючы яму была створаная беларуская царква ў ЗША: "Амэрыканскія беларусы прапанавалі сабраць дапамогу для Радзімы – два караблі. Я пераканаў нашага Філярэта (у 1990-я), адкрыў там царкву. Трэба дапамагаць такой царкве. Туды штодня ходзіць ня менш за 300 беларусаў. Яны моляцца, размаўляюць пра Беларусь".

Пра якую царкву ён гаворыць?

***Уласны карэспандэнт***

# ТБК у беларускім Паазёр'і

Сябры Таварыства Беларускай Культуры ў Літве наведалі 4-5 ліпеня 2009 г. этнічную Бацькаўшчыну. Гэтым разам праехаліся па маршруце Вільня-Камаі-Паставы-Глыбокае-Мосар-Мядзел-Радкі-Вілейка-Забродзьдзе-Жупраны-Вільня.

У кожным мпесцы нас чакалі запамінальныя сустрэчы з мясцовымі краязнаўцамі, іншымі цікавымі людзьмі. Назаўсёды застануцца ў памяці маляўнічыя краявіды і памнікі страсьветчыны беларускага Паазёр'я.

Самым цікавым і ў той жа час балючым момантам, было наведваньне аднаго з сьвеце мэмарыялу Зьніклых вёсак (архітэктар Анатоль Капцюг). Аўтар нам распавёў аб сваёй ідэі. У аснове – малекула ДНК, іншымі словамі, аснова жыцьця. І паабапал яе камяні са сьпісамі неіснуючых вёсак. На заднім пляне вёска-прывід і студня-журавель, як напімін аб былых вёсках. „Прыпыніся вандроўнік! Дакраніся рукою і сэрцам да гэтых камянёў. І няхай твая душа напоўніцца любоўю да роднай вёскі, роднай сядзібы і хаты, якія зьнёс бязьлітасным подыхам няўмольны час. Няхай заўсёды будуць з табой пачуцьцё нашчадка сваіх блізкіх і далёкіх продкаў, адчуваньне сваіх каранёў, Бацькаўшчыны", – гаворыць надпіс на маўклівым камяні.

У часе вандроўкі мы зразумелі, што Беларусь вечная, яна па за часам і па за сыстэмамі і ўладамі. Беларусь – гэта яе зямля і яе людзі.

***Алесь АДАМКОВІЧ***




***Надпіс на камяні мэмарыялу Зьніклых вёсак.***

Bielarus559c.qxd 7/31/2009 12:15 AM Page 6



# Каляндар "БЕЛАРУСА"

**1 жніўня 1994 г.** ня стала **Міхася Палюховіча**. Ён паходзіў зь Сернікаў на Палесьсі (нар. у 1925 г.). За немцамі быў вывезены на прымусовыя працы, застаўся на Захадзе. Жыў у беларускім лягеры ў Ватэнштэце, быў скаўтам. Затым Палюховічы выехалі ў Паўночную Каралíну. Праз некаторы час Міхась перабраўся ў Саўт-Рывэр, дзе далучыўся да мясцовай грамады. Быў рэгентам царкоўнага хору, скарбнікам часапіса "Беларуская думка", уваходзіў ва ўправу Кангрэсавага камітэту ды быў сябрам будаўнічага камітэту тамтэйшай парафіі. Словам, быў адным з тых, на кім трымаўся беларускі Саўт-Рывэр.

**4 жніўня 1994 г.** у Лёндане памёр **Уладзімер Мароз**. У 1940 г. яго, васьмігадовага хлопца, разам з бацькамі бальшавікі з роднай Століншчыны вывезьлі пад Архангельск. Потым яго брат Мікалай трапіў у Армію Андэрса, а сваякоў, як цывільных, адправілі жно ў далёкую Танзанію. Па вайне Марозы перабраліся ў Англію. Уладзімер Мароз браў удзел у грамадзкім руху, пасьля высьвяціўся на дыякана і пэўны час дапамагаў у службах у лёнданскай парафіі сьв. Еўфрасіньні. Пахаваны на могілках North Sheen cemetery.

**15 жніўня 1924 г.** у Дуброве



(сёньня Рэчыцкі р-н) нарадзіўся **Павал Гуз** – беларускі грамадзкі дзеяч у Аўстраліі. Гуз быў сакратаром першага створанага ў Мэльбурне беларускага клюба, культурна-асьветным рэфэрэнтам Беларускага аб'яднаньня, потым доўга ўзначальваў Беларускі цэнтральны камітэт у Вікторыі, ад 1989 г. быў сакратаром Фэдэральнай рады беларускіх арганізацый у Аўстраліі. Памёр 17 жніўня 2003 г. на другі дзень пасьля дня народзінаў.

**24 жніўня 1924 г.** у Касцюках на Шаркаўшчыне прыйшоў на сьвет **Аляксандар Жданковіч**. Гэта быў прыкметны грамадзкі дзеяч у Брытаніі. Амаль ад самага пачатку быў у Згуртаваньні Беларусаў Вялікабрытаніі, потым перайшоў у апазыцыю – Хрысьціянскае аб'еднаньне беларускіх работнікаў, ды ўзначальваў Лёнданскі акругковы аддзел. У 1962 г. стварыў беларускую школку. У пачатку 1970-х вярнуўся ў ЗБВБ і ад таго часу стала быў у кіраўніцтве, а ў 1995 г. яго абралі старшынём. Памёр у 1996 г., пахаваны на могілках Greenford Park.

**27 жніўня 1899 г.** у Новым Сьвержані нарадзіўся **Ксэнафонт Вайцяхоўскі**. У 1930-я ён арганізоўваў грамадзка-культурнае жыцьцё на Стаўпеччыне. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у структурах Беларускай Народнай Самапомачы. Ад лета 1944 г. – на эміграцыі. Па вайне апынуўся ў беларускім лягеры ў Рэгенсбургу, падчас расколу стаў на бок БЦР. Эміграваў у ЗША ў 1949 г. Пасьля нядоўгай працы ў Арканзасе (зьбіраў бавоўну ў фармэра), пераехаў у горад Саўт-Рывэр. Уваходзіў у кіраўніцтва царкоўнага камітэту, а ў 1950-х гадох узначальваў Злучаны Беларуска-Амэрыканскі Дапамаговы Камітэт. Як і Міхась Палюховіч пахаваны на беларускіх могілках у Саўт-Рывэры.

**28 жніўня 1914 г.** у Паньках (сёньня – Івейскі раён Гарадзенскай вобласьці) нарадзіўся **Нікандар Мядзейка**, другі прэзыдэнт БЦР. Да пачатку нямецкай акупацыі Мядзейка пасьпеў павучыцца ў настаўніцкай сэмінарыі ў Барунах, скончыць гімназію ў Вільні, паслужыць у польскім войску і нават панастаўнічаць за першымі саветамі ў Маладэчне. За немцамі Мядзейка настаўнічаў, а таксама працаваў у структурах Самапомачы. З 1944 г. – на эміграцыі, скончыў унівэрсытэт УНРРА з дыплёмам інжынэра меліярацыі, у 1948 г. разам зь сям'ёю выехаў у Францыю. Фінансавае становішча там было жудаснае, Мядзейкі ледзь сточвалі канцы з канцамі. У 1954 г. перабраўся ў ЗША ды пасяліўся ў Нью-Брансўіку. Браў актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці, ад 1954 г. быў віцэ-прэзыдэнтам БЦР, а ў 1977 г. абраны, пасьля сьмерці Астроўскага, прэзыдэнтам БЦР. Памёр у 1987 г. Пахаваны на беларускіх могілках у Саўт-Рывэры.

***АГ***

# Лісты ў рэдакцыю

У чэрвеньскім нумары газэты "Беларус" былі зьмешчаныя два артыкулы пра нядаўні Кангрэс БАЗА. Адзін зь іх, які напісала Ганна Сурмач, цікава адлюстраваў прабег Кангрэсу зь пералікам фактаў, прозьвішчаў ды памяркоўнымі падсумаваньнямі.

Другі артыкул, аўтарства Віталя Зайкі, нажаль, вызначаўся шэрагам канкрэтных памылак, прапушчаных ключавых фактаў, асабістых нападаў ды незразумелай блытанінаю вакол арганізацыйных правілаў. Аднак, засяродзімся на канкрэтных пунктах:

1. Вядома, што канчатковы парадак дня любога грамадзкага сходу прыймаецца на самім сходзе, зрабіўшы прапанаваныя ўдзельнікамі сходу зьмены у раней пададеным для зацьвярджэньня тэксце. Крытыка пра ўвядзеньне ў прапанаваны раней парадак дня аднаго новага пункту на сходзе ня ёсьць абгрунтаванаю. Кангрэс мае поўнае права карэктаваць прапанаваны раней парадак дня, тым больш, што інфармацыя пра гэты новы пункт была разасланая да ведама за тыдзень да Кангрэсу.

2. Пастанова аб пераліку сродкаў аддзеламі ў Галоўную Управу БАЗА была прынятая на папярэднім Кангрэсе. Сёлетні Кангрэс пацьвердзіў, што залегласьць за 2006, 2007 гады павінна быць заплачанаю. Гэты факт быў прапушчаны ў артыкуле, як і той факт, што Вітаўт Кіпель быў прызначаны старшынём камісіі, якая мае ўдакладніць працэдуру пераліку сродкаў у будучыні.

3. У апісаньні дыскусіі вакол абмежаваньня тэрмінаў кадэнцыі старшыняў поўная блытаніна. Найперш, прапушчаны той факт, што абмежаваньне тычыцца колькасьці тэрмінаў запар, бо якраз адсутнасьць гэтага ўдакладненьня стварае ўражаньне, што адыходзячы старшыня ніколі ўжо ня можа быць нанова абраным, а гэта няпраўда.

У Статуце БАЗА існуе палажэньне наконт правамоцнасьці прынятых пастановаў. У артыкулах II і III гаворыцца: "Кіраўніцтва ўсяе дзейнасьці БАЗА канцэнтруецца ў Галоўнай Управе, якая складаецца з Рады дырэктараў і Управы БАЗА". "Рада дырэктараў можа вырашаць кожную ўзьніклую справу, што не прадугледжаная Статутам БАЗА і не належыць да выключнай кампэтэнцыі Кангрэсу".

Значыць, Кангрэс мог скасаваць прынятую Галоўнай Управай пастанову аб абмежаваньні тэрмінаў, аднак, Кангрэс вырашыў пакінуць яе ў сіле, пачынаючы ад часу прыняцьця гэтай пастановы.

Сп. Зайка прысьвяціў гэтаму пытаньню амаль палову свайго артыкулу, зблытаў свае асабістыя меркаваньні з арганізацыйнымі правіламі і палажэньнямі Статуту БАЗА. Аўтар назваў асноўнаю прычынаю, чаму ня трэба абмяжоўваць тэрміны, такі факт, што на пасаду старшыні, якую ён займае ўжо 11 гадоў, могуць прыйсьці некампэтэнтныя людзі.

Няўжо сярод усіх сяброў ня знойдзецца нехта кампэтэнтны?

Тут варта адзначыць, што сп. Зайка запрашаўся на кожнае паседжаньне Галоўнай Управы БАЗА, але ніводнага разу не прыйшоў сам, не прыслаў свайго прадстаўніка і нават не адгукнуся ніякім іншым чынам.

4. І, нарэшце, яшчэ адна, хоць і дробная, але прыкрая, памылка. Сп. Зайка назваў скарбнікам Галоўнай Управы сп. Сяргея Пятровіча ў той час, як на гэтую пасаду ў другі раз абрані сп. Сяргей Капытка.

***Вячка СТАНКЕВІЧ,***
***старшыня Галоўнай Управы БАЗА***

Ул

У лісьце, дасланым сп. Станкевічам, зноў, як гэта было зроблена падчас Кангрэсу, праігнараваная сутнасьць заўвагаў адносна дзеяньняў па адвольным зьмяненьні Статуту БАЗА. Зноў паўтараецца памылковы тэзіс аб тым, што ўвядзеньне абмежаваньня на колькасьць тэрмінаў (запар ці не) ёсьць у межах кампэтэнцыі Галоўнай Управы, якая быццам вырашае пытаньне праз свае пастановы, якія прапаноўваецца зацьвердзіць Кангрэсу. Нагадаю, што зьмены Статуту рэгулююцца артыкулам XIV, які гаворыць наступнае: "Стутут можа быць зьменены на кожным Кангрэсе БАЗА звычайнай бальшынёй галасоў з умовай, што поўны тэкст прапанаваных зьменаў быў далучаны да паведамленьня, якое склікала гэткі Кангрэс, а сама прапанова зьменаў была прынятая папярэднім Кангрэсам." Як бачым, умова не была дагледжана.

Поўнага тэксту зьменаў не было нават на самым Кангрэсе, а сп. Станкевіч заклікаў не праводзіць абмеркаваньня гэтага пытаньня, "бо ўжо прынятая пастанова, застаецца прагаласаваць". Праз працэдурныя маніпуляцыі і дэзарыентацыю дэлегатаў Кангрэсу, у абыход статутовых нормаў быў фактычна зьменены Статут БАЗА. Прычым мае патрабаваньні дагледзець статутовыя нормы чамусьці ўспрымаюцца сп. Станкевічам і ягоным атачэньнем як пэрсанальныя напады. Цікава, што пытаньне, якое сп. Станкевіч, а пад ягоным уплывам і Галоўная Управа, палічылі такім надзённым і неадкладным, было дададзенае да парадку дня толькі за тыдзень да Кангрэсу.

Таксама хачу нагадаць, што працэдура выбараў у Нью-Ёркім аддзеле БАЗА ёсьць адкрытая і правераная часам, і любыя меркаваньні наконт кампэтэнтнасьці кандыдатаў вырашаюць сябры аддзелу праз адзіна правільны мэханізм — дэмакратычныя выбары. Абмежаваньне тэрміну старшынства ёсьць абмежаваньнем права сяброў аддзелу вырашаць лёс свайго калектыву.

***Віталь ЗАЙКА***

Атрымала 6-га ліпеня газэту "Беларус" за ліпень месяц 2009 году і вельмі засмуцілася, калі прачытала на 7-й бачыне артыкул пад загалоўкам "Справы, датычныя свабоды рэлігіі ў Беларусі, агляд судовых справаў у акруговых апэляцыйных судах ЗША".

Нам трэба пратэставаць, пішучы да прэзыдэнта Абамы і просячы яго неадкладна зволіць усіх гэтых судзьдзяў і заміняць іх судзьдзямі, якія вераць у Бога. Цяперашнія судзьдзі вельмі шкодзяць нашым праўдзівым поглядам на справы рэлігійнага перасьледу ў Беларусі і ва ўсім сьвеце. Яны імкнуцца дапусьціць у Амэрыку людзей, якія зьяўляюцца атэістамі. На мой погляд, ліст да прэзыдэнта можа быць прыкладна наступнага зьместу:

*President Barak Abama*
*The White House*
*Washington, DC 20500*

Dear President,

I (we) undersigned hereby wish to ask you to help the people of BELARUS and other counties who suffer of religious persecution. Our immigration judges refuse any asylum to all those who cannot return home because of severe persecution on the religious ground. They not only harm the persecuted people but United States of America by refusing the asylum to people who need our compassion and our help. They refuse the asylum on the ground on not having enough evidence, but they support people who are godless in order to increase atheism in America.

We prey and hope that you will honor our request.

Respectfully yours,

...

Трэба падаць сваё імя і дакладны паштовы адрас. Спадзяюся, што чытачы газэты "Беларус" адгукнуцца і падтрымаюць маю прапанову.

Жыве Беларусь!

***Вера РАМУК***

Калі чытаю навіны на сайтах Хартыі 97 ці Радыё Свабода, калі цікаўлюся дзейнасьцю апазыцыі ў Беларусі, дык становіцца сумна. Калі чую, што некаторыя дзеячы апазыцыі пайшлі "на працу" да ўладаў, як было паўгады таму; ці чую, што вулічныя акцыі апазыцыі прайшлі не на заплянаваным месцы, а там, дзе дазволілі ўлады, то разумею, што стан нашай апазыцыі ня проста дрэнны, а жахлівы... Няма лідэра, які мог бы павесьці за сабою, няма партыі ці арганізацыя, якая магла-б зьяднаць народ.

Апазыцыя сёньня складаецца пераважна з моладзі (у асноўным студэнтаў). Гэта добра і кепска адначасова. Добра, бо моладзь – гэта надзея нацыя, яе будучыня, а кепска, бо моладзь мае мала досьведу палітычнай барацьбы. Акрамя гэтага студэнты вельмі залежныя ад уладаў, за любыя правіны іх выганяюць з вучобы, ставячы крыж на будучай кар'еры. Шукаючы выйсьця, усё больш і больш моладзі зьяжджае замяжу. Нацыя губляе сваіх лепшых людзей. Акрамя гэтага моладзь – гэта ня толькі надзея нацыі, але і паскаральніца прагрэсу, бо яна хоча ня проста лепшага жыцьця, а, сапраўды, найлепшага. І яна робіць усё для выкананьня сваёй мары. І вось гэтую частку грамадзтва, якая рухае прагрэс напрад, нашая нацыя губляе.

Але ўсё-ж застаецца надзея, што калі-небудзь мы ўсе зможам вярнуцца на радзіму адукаваныя, інтэлігентныя. А нашыя сувязі з замежжам дапамогуць пабудаваць добрую эканоміку.

Спадзяюся, Беларусь мае будучыню...

***Сяргей ШЫРОКІ***

Bielarus559c.qxd 7/31/2009 12:15 AM Page 7




# Весткі й Паведамленьні

Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня
Viestki j Paviedamlenni
Belarusan American Association, Inc.
166-34 Gothic Drive, Jamaica, N.Y. 11432 Сусьветнае сеціва: www.baza-belarus.org № 8 (523)


# Ліпеньскі сход аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку

У нядзелю, 12 ліпеня, прайшоў чарговы сход аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку, якія адбываюцца ў Фундацыі імя П. Крэчэўскага ў кожную другую нядзелю месяца. Напачатку старшыня аддзелу Віталь Зайка даў кароткі агляд падзеяў у Беларусі. Ён у прыватнасьці спыніўся на падзеях лета 1994 году і прэзыдэнцкіх выбарах, вынік якіх стаў сумнай датай у найноўшай гісторыі Беларусі, праклаў дарогу да скасаваньня дэмакратычных свабодаў, вынішчэньня беларускай мовы і культуры, зрабіў незалежнасьць краіны прадметам гандлю. Затым былі ўзгаданыя "камбайнавы крызіс" у адносінах з Расеяй, новая дэвальвацыя беларускага рубля, перасьлед Маладога Фронту – справа А. Дубскага, візыт амэрыканскіх кангрэсмэнаў у Менск і вызваленьне грамадзяніна ЗША Зэльцара, асуджанага па таямнічай крымінальнай справе, зь якой вынікае існаваньне сувязяў Лукашэнкі з алігархам Беразоўскім.

## Уручэньне Мэдаляў Грыгаровіча-Чарняўскага

Перад прысутнымі выступіў сп. Генадзь Кокар зь Менску, які коратка распавёў пра сытуацыю ў Беларусі ў сфэры духоўнай. Ён адзначыў цяжкасьці, зь якімі сутыкаецца беларуская нацыянальная справа, асабліва справа нацыянальнай беларускай царквы. Сп. Кокар, як прадстаўнік Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Народнай Царквы (БАПНЦ), сказаў: "Царква нашая вымушана працаваць падпольна і вандраваць. Перасьлед з боку ўладаў вельмі моцны, адсочваньне шчыльнае. Вы чулі пра разбурэньне нашага храму ў пасёлку Пагранічны. Цяпер забаронена аднаўленьне храму ў Сёмкавым Гарадку. Але прыхільнікі Царквы працягваюць гуртавацца вакол ідэі сваёй беларускай Царквы, а яе сьвятары і вернікі працягваюць служыць Богу нават пры адсутнасьці храмаў. Бо Царква – гэта ня проста цыбуліна з крыжам, а супольнасьць людзей, якія славяць Бога і жывуць згодна зь сьв. Пісаньнем. Адным з апошніх мерапрыемстваў БАПНЦ было перазахаваньне парэштказ ахвяраў сталінізму, якія вандалы выкапалі і раскідалі ў Курапатах. Не абыйшлося без правакацыяў з боку міліцыі – прыйшлі "правяраючыя", сталі корпацца ў касьцях з мэталашукальнікам. Але ўрэшце хрысьціянскае пахаваньне адбылося, прагучэлі малітвы па-беларуску."

Затым сп. Г. Кокар коратка распавёў пра мэдаль з Пагоняй "Беларускія айцы-асьветнікі Ян Грыгаровіч і Уладзіслаў Чарняўскі", які быў усталяваны Вышэйшай Радай БАПНЦ для адзначэньня заслугаў на ніве беларускай грамадзкай і духовай працы. Мэдаль названы ў гонар беларускіх сьвятароў – праваслаўнага а. Яна Грыгаровіча і каталіцкага а. Уладзіслава Чарняўскага. Хоць жылі яны ў розны час, Грыгаровіч — у 19 ст., а Чарняўскі — у 20 ст., іх яднала любоў да Беларусі і пастырская праца на карысьць беларускага народу. Між іншага БАПНЦ спрычынілася да выданьня перакладу Біблії на беларускую мову, зробленага а. Уладзіславам Чарняўскім. 10 лютага сёлета мэдаль Грыгаровіча-Чарняўскага быў прысуджаны знакамітым дзеячам беларускай грамады ў ЗША Антону Шукелойцю і Алесю Міцкевічу. Сп. Кокар зачытаў узнагародную грамату і ўручыў мэдаль на бел-чырвона-белай стужцы сп. А. Шукелойцю, а той выступіў з кароткім словам, падзякаваў за гонар. Пазьней мэдаль быў таксама ўручаны сп. Алесю Міцкевічу ў ягонай хаце, дзеля таго што ён па стане здароўя не змог прыехаць на сход БАЗА. Сп. Міцкевіч таксама падзякаваў за ўзнагароду і прывітаў госьця з Бацькаўшчыны.

## Дзейнасьць БАЗА і кантакты ў Вашынгтоне

Затым слова ўзяў сп. Вячка Станкевіч, старшыня Галоўнай управы БАЗА. Ён распавёў пра кантакты арганізацыі з амэрыканскімі афіцыйнымі асобамі ў Вашынгтоне. Між іншага, было ўзгадана пра сустрэчы з былой амбасадаркай ЗША ў Менску спн. Карэн Ст'юарт, а таксама з кангрэсмэнамі і прадстаўнікамі Дзярждэпартаманту, якія адказваюць за дачыненні зь Беларусьсю. Была праведзена гутарка з Джэфам Трэмблам з Нацыянальнай Рады Бясьпекі і з кіраўніком амэрыканскага вяшчаньня на замежжа. Адбылося спатканьне з Андрэем Саньнікавам, каардынатарам "Хартыі-97", які заявіў аб намеры балятавацца на пасаду прэзыдэнта Беларусі ў 2011 годзе.

Далей сп. Станкевіч таксама спыніўся на працы і праграмах беларускай рэдакцыі "Радыё Свабода" ў Празе, закрануў тэмы, зьвязаныя з моўнай палітыкай.

Пасьля сп. Станкевіч, які зьяўляецца таксама віцэ-старшынём Рады БНР, а нядаўна быў абраны Старшынём Фундацыі імя П. Крэчэўскага, спыніўся на дзейнасьці Фундацыі, адзначыўшы, што яна была створаная Радай БНР для забесьпечаньня існаваньня свайго архіву і музэю, і таксама аказвала дапамогу ў выдавецкай дзейнасьці. Цяпер разгортваецца новая дзейнасьць, прафэсійны архівіст зьбірае архіў БНР. Сп. Станкевіч заклікаў прысутных далучацца да Фундацыі ў якасьці сяброў.

Затым з кароткім паведамленьнем пра гісторыю БНР і яе архіваў выступіла архівістка БНР Ганна Сурмач. Яна спынілася на важнасьці захаваньня гістарычных зьвестак пра БНР, а таксама пра беларускую прысутнасьць у сьвеце, у тым ліку ў Амэрыцы.

## 15 год лукашызму – падзеі, якія прывялі да антыбеларускага кіраваньня

Старшыня БНФ Зянон Пазьняк выступіў з аналізам падзеяў 1993-1994 году, якія прывялі да прыходу ва ўладу антыбеларускіх сілаў начале з Лукашэнкам. Прамоўца ў прыватнасьці сказаў: "Днямі надыйшла сумная гадавіна – 15 год панаваньня дыктатуры ў Беларусі. Падзеі таго часу – ужо гісторыя, але іх трэба памятаць і рабіць высновы. Я добра ведаю Лукашэнку па сваёй працы ў парлямэнце (Вярхоўны Савет 13 скліканьня), дзе лічылі яго фігурай несур'ёзнай, нявартай увагі. Я лічыў яго цёмнай асобай, якая выступала зь незразумелымі гістэрычнымі прамовамі, у якіх канец і пачатак маглі супярэчыць. І ў выніку яго недаацанілі, і цяпер гэтая злая цёмная фігура карыстаецца неабмежаванай уладаў, зьнішчае беларускасьць, падаўляе ўсе праявы нязгоды. Нядаўна ён заявіў, што

Заканчэньне на бачыне 6



Сп. сп. А. Міцкевіч, А. Шукелойць і Г. Кокар.

### Уплаты ў нью-ёрскі аддзел БАЗА
### Ахвяраваньні й складкі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Р. Бабаш | 90 | Р. Зайка | 50 |
| М. Вашкевіч | 80 | В. Запруднік | 50 |
| А. Орса-Романо | 80 | М. Клакоцкі | 50 |
| К. Романо | 80 | Л. Крэчык | 50 |
| С. Гойдзь | 60 | І. Куніцкі | 50 |
| Б. Андрусышын | 50 | Г. Сурмач | 50 |
| Ю. Андрусышын | 50 | Ю. Хруцкая | 50 |
| В. Балашчанка | 50 | А. Шукелойць | 50 |
| Т. Вашкевіч | 50 | М. Агароднік | 30 |
| М. Давідзюк | 50 | У. Цяліца | 30 |
| В. Зайка | 50 | | |

Шчыры дзякуй!

## Наступны сход

нью-ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **9 жніўня 2009 году** ў Фундацыі імя П. Крэчэўскага па адрасу:
*166-34 Gothic Drive, Jamaica, NY 11432*
Даезд цягнікам падземкі **F** да прыпынку **169th St**; адтуль 2 блёкі да скрыжаваньня **167-й вул.** і **Готык Драйв.** Пачатак сходу а 1:00 папаўдні.

Уплаты ў нью-ёрскі аддзел дасылайце на адрас:
*Belarusan American Association*
*P. O. Box 230249*
*Brooklyn, NY 11223*
Чэкі выпісвайце на
*Belarusan American Association.*

**Нью-Ёрскі аддзел БАЗА даводзіць да ведама ўсіх сяброў і прыхільнікаў, што на 18 кастрычніка сёлета прызначана сьвяткаваньне важнай падзеі—**
60-ГОДЗЬДЗЯ ЗАСНАВАНЬНЯ БЕЛАРУСКА-АМЭРЫКАНСКАГА ЗАДЗІНОЧАНЬНЯ
**Наконт канкрэтнай інфармацыі пра падрабязнасьці падрыхтоўкі і правядзеньня сьвяткаваньня сачыце за нашымі аб'явамі на сходах, у газэце "Беларус" і ў сеціве.**

* * *

*Сябры і кіраўніцтва Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА віншуюць свайго паплечніка і калегу сп. **Зьмітра ЛЕВІТА** з важным дасягненьнем у ягоным вайсковым жыцьці—атрыманьнем вайсковага званьня **СЯРЖАНТА** войска Злучаных Штатаў.*
*Зычым здароўя і ўдачы, а таксама хуткага прасоўваньня наверх па прыступках вайсковай лесьвіцы.*

* * *

У сувязі зь зьяўленьнем пытаньняў адносна паведамленьняў, якія рассылае на электронныя адрасы сяброў і прыхільнікаў БАЗА спадар Анатоль Старкоў, лічым патрэбным заявіць наступнае: сп. А. Старкоў ніколі не зьяўляўся сябрам БАЗА, і ён не ўваходзіць у кіраўнічыя структуры БАЗА. Ягоныя асабістыя апініі не маюць нічога агульнага з пазыцыяй і поглядамі БАЗА.
*Управа Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА*

Bielarus559c.qxd 7/31/2009 12:15 AM Page 8



# Прэзэнтацыя новай кнігі З. Пазьняка

У грамадзкай залі сабору сьв. К. Тураўскага ў Брукліне 28 чэрвеня 2009 году адбылася прэзэнтацыя кнігі Зянона Пазьняка "Нацыянальныя каштоўнасьці", прысьвечаная ролі і значэньню нацыянальнай культуры.

Перад прысутнымі выступіў аўтар. Ён адзначыў, што беларусам вельмі важна зрабіць тое, што не было зроблена на працягу XX стагодзьдзя – стварыць тэорыю нацыянальнага Адраджэньня. З гэтай мэтай у Беларусі КХП – БНФ арганізавала спэцыяльныя сэмінары – "Ідэалы БНР і беларускае Адраджэньне", – якія праводзяцца кожны год. Даклады і рэфэраты на канфэрэнцыю рыхтуюцца па канцэптуальных пытаньнях развіцьця Беларусі і яе нацыянальнага жыцьця.

Кніга "Нацыянальныя каштоўнасьці" (як і некаторыя ранейшыя, прыкладам, "Развагі") падпарадкаваная гэтай мэце. "Мы павінны сыстэмна думаць пра нашую культуру, дзяржаву, будучыню, народ.", – сказаў сп. Пазьняк. Запатрабаванасьць у такой працы ў беларускім грамадзтве ёсьць, асабліва сярод моладзі.

"У кнізе адлюстраваныя, у асноўным, каштоўнасьці асноватворныя: мова, чалавек, народ, тэрыторыя, культура народу, сьцяг, герб і г. д. Усё гэта разгледжана ў сутнасным значэньні (што такое ёсьць сама зьява, чаму яна гэтакая, а не іншая, чаму безь яе нельга абыйсьціся). Першае, што ліквідаваў антыбеларускі рэжым на Беларусі – гэта наш герб і сьцяг. Трэба тлумачыць, чаму яны гэта рабілі, і што гэта значыць, чаму ў гісторыі за сьцяг людзі ішлі на сьмерць. У цяперашняй акупацыйнай школе і ўнівэрсытэце пра гэта ўжо ніхто ня скажа", – падкрэсьліў аўтар.

Кніга адмыслова выйшла невялічкім "кішэнным" фарматам, каб можна было лягчэй ёю карыстацца, чытаць і перадаваць у любых варунках, ведаючы сытуацыю, якая ёсьць у Беларусі.

Падрабязьней Зянон Пазьняк спыніўся на важнейшым аспэкце тэмы – аспэкце культуры. Некалькі артыкулаў ён прысьвяціў мове, бо гэта, на думку аўтара, самае галоўнае, што робіць нас нацыяй, народам і дзяржавай, а для беларусаў – гэта каштоўнасьць нумар адзін. – ...За апошнія часы сьвет вельмі перамяніўся. Працэс глябалізацыі – аб'ектыўны, ён ідзе незалежна ад нас, – працягваў аўтар. – Каб застацца самымі сабой, каб захаваць сваю ідэнтычнасьць, нацыянальную культуру, каб мацаваць сваю дзяржаву і стымуляваць яе развіцьцё, – патрэбна ўсьведамленьне нацыянальнай культуры. Культура зараз, фактычна, трымае ўсе народы. Культура, традыцыі цэментуюць і даюць магчымасьць нам ня зьнікнуць, не растварыцца ў сьвеце. На сёньняшні дзень культура робіца адной з галоўных прыкметаў суверэнітэту. (Раней гэта былі межы. Цяпер межы свабодныя, чалавек можа езьдзіць па ўсім сьвеце.)




Культура яднае кожны народ. Сучасны рэжым на Беларусі хоць і не такі жорсткі, як, сталінскі, але ён антынацыянальны, антыбеларускі, ён зьнішчае нашую культуру, і абніжае яе ўзровень.

Гэты разбуральны, прымусовы рэгрэс вельмі небясьпечны, ён раскансалідоўвае нацыю. Людзі атрымоўваюць адукацыю (у чужой мове) – і не разумеюць каштоўнасьці нацыянальнай культуры. Яны проста выпадаюць з культуры нацыі, зь яе гістарычнага кантэксту."

У працэсе гаворкі аўтарам былі закранутыя шматлікія пытаньні гнасеалёгіі культуры: яе паходжаньне, шляхі развіцьця, які сэнс укладаецца ў шырокае паняцьце "культура" (усё, што створана чалавекам, яго рукамі і розумам) і ў вузейшы сэнс гэтага слова (як духоўная, творчая, мастацкая дзейнасьць чалавека), у чым адрозьненьне паміж культурнымі цывілізацыямі і варварамі.

У сваіх выступах (Вітаўт Кіпель, Антон Шукелойць, Сяргей Капытка, Ларыса Пузач, Тацьцяна Красоўская) падзякавалі аўтару за шчырую працу на карысьць Бацькаўшчыны, высока ацанілі новае выданьне і выказалі пажаданьне творчых посьпехаў аўтару ў далейшым.

Свой выступ Вітаўт Кіпель пачаў з успаміну пра брашуру В. Ластоўскага "Што трэба ведаць кожнаму беларусу", якая яго ўразіла ў юнацтве. "Калі Зянон Пазьняк даў мне сваю кніжку, я зразумеў, што мы як нацыя сягнулі значна далей, чым тады, калі пісалася кніга Ластоўскага... Хацелася, каб кожны прачытаў гэтую кніжку. Бо сапраўды, як у кнізе адзначана, у гэтым падручніку, у гэтай лекцыі, мова – гэта асноўнае, што нас трымае разам", – падкрэсьліў выступоўца.

Спадар Кіпель падкрэсьліў таксама станоўчыя разважаньні Зянона Пазьняка ў кнізе пра небясьпеку падмены культуры на эрзац-культуру: "Паход на нас ніколі не спыняўся, ён ня спынецца, пакуль Расея не дасягне свайго. Але, з другога боку, мы мацнеем, дзякуючы таму, што выходзяць такія кнігі, як кніга З. Пазьняка "Нацыянальныя каштоўнасьці".

Ларыса Пузач адзначыла: "Важна даць даніну ўдзячнасьці сп. Пазьняку за яго змаганьне за Беларусь. Сваімі кнігамі, творчым словам Зянон Пазьняк фармуе наш беларускі дух. Кніга "Нацыянальныя каштоўнасьці" мае вялікую вагу, у ёй аўтар напамінае нам, што трэба верыць у Хрыста і Беларускую ідэю".

"У гэтым годзе, – сказаў Антон Шукелойць, – якраз выпадае шмат юбілеяў грамадзкіх і выдатных людзей. У шэрагу гэтых юбілеяў і наш паважаны Зянон Пазьняк. Ён мае вялікія абдоранасьці, зацікаўленьні ў розных дзялянках грамадзкага, палітычнага, мастацкага жыцьця. І ў кожнай з гэтых дзялянак ён актыўны і заўсёды – зь вялікай карысьцю для беларускага народу. Па сваёй асьветніцкай справе З. Пазьняк – доктар мастацтвазнаўства. І выглядала-б, што ў гэтай галіне ён і мусіўбы працаваць. І здольнасьці ў яго ў гэтым кірунку вялікія. Але ён працаваў у іншых сфэрах, напрыклад, гісторыі, археалёгіі...

Кніжачка "Нацыянальныя каштоўнасьці" – другая такога кшталту пасьля невялічкай брашуры Ластоўскага, у якой усё аб Беларусі, якую можна пакласьці ў кішэнь, потым пераглядаць і чытаць усюды. Артыкулы, якія тут сабраныя, цікава прачытаць не адзін раз. Сп. Пазьняк – чалавек шырокага зацікаўленьня. І ў кожнай з гэтых яго зацікаўленьняў ён стараецца нешта пакінуць, што-б рэпрэзэнтавала беларускую справу. Кажная ягоная дзялянка зацікаўленьня вызначаецца кніжкай, якую ён выдае для нас усіх, для беларускага грамадзтва. Жадаю доўгіх год, выдатнай працы на дабро беларускага народа з такім запалам і шчырыней поглядаў, як працаваў да гэтага часу."

Такім чынам прэзэнтацыя новай кнігі перайшла ў віншаваньне з нагоды 65-годзьдзя Зянона Пазьняка. Пранікнёна чытала вершы Зянона Тацьцяна Красоўская, прысутныя цёплымі словамі і пажаданьнямі віншавалі сп. Пазьняка, сьпявалі "Шмат год", гучала (у запісе) песьня-раманс Ігара Лучанка "Авэ-Марыя" на верш Зянона "Гучаньне анёльскага голасу".

Асабліва крануў выступ 6-гадовай Паўлінкі Падлескай (унучкі вядомага, сьветлай памяці, ветэрана БНФ Генадзя Банкевіча), якая прачытала вершы беларускіх паэтаў і прасьпявала беларускія песьні.

Відаць было, што ўсім прасутным добра знаходзіцца разам, слухаць беларускія сьпевы і нацыянальную музыку. Прыязныя гаворкі, пачастункі, цёплыя словы яшчэ доўга не адпускалі, не давалі сябрам разыходзіцца. Разам – было хораша і ўтульна.

На заканчэньне, што адпавядала агульнаму настрою, быў прачытаны верш Зянона "Свае":

У цёмную ноч
Перад Днём Задушным,
Калі ўжо маўчалі дрэвы і травы,
Трывожна было на душы.
Хтось пастукаў у шыбы:
– Хто там?
– Свае.
Як добра!

*Марыля ЯКУШЭВІЧ*

## Ліпеньскі сход аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку

*Заканчэньне з бачыны 5*

ён "наеўся ўлады" і зробіць так, каб "павароту не было". Ён недагаворвае, але ясна, што справа ідзе пра зьнішчэньне мовы, культуры, гісторыі, якія ён ненавідзіць, каб беларуская незалежнасьць была пазбаўленая беларускага зьместу – вось ягоная задача. І калі такая асоба, з такой нянавісьцю і з такой неабмежаванай уладай кіруе – гэта вельмі небясьпечна для нацыі.

Прайшло 15 год. Прыпомнім, падумаем, як атрымалася, што вораг Беларусі перамог у 1994 годзе? На гэтым сёньня хачу спыніцца падрабязьней.

У 1991 годзе адбыўся цуд – мы ўпершыню за стагодзьдзі вярнулі сабе незалежнасьць, з 25 жніўня 1991 году стала будавацца сучасная беларуская нацыянальная дзяржава. За гэтую справу ўзяліся нацыянальныя сілы ў Вярхоўным Савеце. Камуністы не хацелі рабіць нічога, усе законапраекты па ўсталяваньні дзяржаўнасьці былі зробленыя апазыцыяй БНФ. Большасьць дэпутатаў ня мелі перакананьняў, яны былі ашарашаныя падзеямі, якія пачалі імкліва разгортвацца, ім не заставалася нічога іншага, як падтрымліваць стварэньне беларускай незалежнай дзяржавы. У выніку фармальным кіраўніком дзяржавы, старшынём прэзыдыюму ВС стаў Станіслаў Шушкевіч, новы чалавек у палітыцы, асоба непасьлядоўная і нерашучая, але ён быў настроены на незалежнасьць і развіцьцё беларускай культуры. Ён замінаў намэнклятурнаму прэм'еру Кебічу, які разам са сваёй групоўкай вырашыў праз адмыслова створаную "антыкарупцыйную камісію" ўкінуць кампрамат на Шушкевіча, а таксама апазыцыю БНФ у парлямэнце, і адхіліць Шушкевіча ад пасады. Старшынём камісіі быў прызначаны Лукашэнка, якога намэнклятуршчыкі палічылі хоць і несур'ёзным, але кіруемым — і таму карысным. "Камісія" накапала ліпавых і прыдуманых фактаў, і ў выніку Шушкевіч зьнялі з пасады за "пакражы скрыні цьвікоў". Але праз піяр вакол працы "антыкарупцыйнай камісіі" імя Лукашэнкі стала вядомым. Ён, хто паўсюль заяўляў пра шкадаваньне аб СССР, пра непрыняцьце незалежнасьці Беларусі, зьезьдзіў у Маскву. Там ён заявіў у Думе, што калі трэба – папаўзе ў Маскву на каленях, што ён за аднаўленьне СССР. Яго ў Маскве "прыкмецілі", узялі пад увагу. На яго паставілі кіруючыя колы Расеі, якія шчыльна, і тады, і цяпер, зьвязаныя з КГБ-ФСБ. З таго часу Лукашэнка стаў карыстацца падтрымкай Расеі.

Кебіч спахапіўся, бо Лукашэнка стаў абганяць яго ў ягонай ўласнай рэторыцы пра ўвядзеньне расейскага рубля, аб'яднаньне з Расеяй. На Лукашэнку зрабілі таксама стаўку т. зв. "маладыя ваўкі" – група палітыкаў без асабістых прынцыпаў, што меркавалі скарыстаць Лукашэнку для прыходу да ўлады. Сярод гэтых "ваўкоў" былі дэпутаты Ганчар, Булахаў, Лябедзька ды іншыя. Булахаў фактычна "правярнуў" заканадаўчую базу для ператварэньня формы ўлады ў Беларусі з парлямэнцкай ў прэзыдэнцкую. Ён забараніў рэфэрэндум, рыхтаваны БНФ. 15 сакавіка была прынятая Канстытуцыя Беларусі, па якой уводзілася пасада прэзыдэнта. Пачалася падрыхтоўка да прэзыдэнцкіх выбараў. Значная колькасьць людзей была супраць палітыкі Кебіча. Але справу перанеў КГБ, і наш электарат, які быў гатовы падтрымаць нас – быў перахоплены. Вывелі "тэрмінатара"-Лукашэнку. М. Статкевіч увёў Шушкевіча ў кандыдаты ў прэзыдэнты, падзяліўшы дэмакратычныя сілы.

Лукашэнка ня меў аніякай праграмы акрамя голага папулізму. Не абыйшлося без праваслаўя, як з папом Радамысьльскім, які быццам падтрымоўваў Фронт, а потым заявіў на тэлебачаньні: "Праваслаўныя! Не галасуйце за Пазьняка, гэта фашыст!" Або з так званым "лёзьненскім тэрактам", калі былі інсцэніраваны замах на Лукашэнку. Задача была – прайсьці ў другі тур. Але апрат Кебіча скарыстаў адміністратыўны рэсурс, падтасаваў вынікі першага туру (каля 10% бюлетэняў), і замест Пазьняка ў другі тур разам з Лукашэнкам выйшаў Кебіч. У выпадку, калі-б Кебіч зьняў-бы сваю кандыдатуру, сытуацыю можна было-б уратаваць. Адбыліся-б перавыбары, з адрозным складам кандыдатаў. Але Кебіч адмовіўся ад гэтага – і прайграў. Новых фальсыфікацыяў не адбылося, бо нават намэнклятура на месцах перакінулася да Лукашэнкі. Пазьней Кебіч у сваіх мэмуарах прызнаў, што рабіў адну з Лукашэнкам справу: "Галоўнае – не дапусьціць Пазьняка". Ён паказаў, што з таго поля ягада, што і Лукашэнка. Тое, што адбылося 15 год таму, мусіць быць належна прааналізавана, і беларускія нацыянальныя сілы павінны кансалідавацца, каб прыйсьці да ўлады і працягнуць будаваньне дзяржавы, што было перарванае 15 год назад".

## Беларускі рух – гэта рух моладзі

З кароткай гутаркай пра моладзь, як рухавік беларускага нацыянальнага руху, выступіў шматгадовы старшыня Галоўнай управы БАЗА да 2007 г. сп. Антон Шукелойць. Ён у прыватнасьці адзначыў, што ад самага свайго пачатку беларускі нацыянальны рух быў справай маладых людзей, быў рухам моладзі. Яшчэ з часоў І. Грынявецкага і газэты "Гоман", ад Багушэвіча і Івана Луцкевіча моладзь складала асноўную сілу беларускага нацыянальнага руху. Шмат моладзі было на 1-м Усебеларускім Канрэсе, была яна і сярод распрацоўшчыкаў Акту 25 Сакавіка. У абедзьвух акупаваных частаках Беларусі моладзь змагалася: за беларусізацыю – пад Саветамі, і супраць нацыянальнага ўціску – пад уладай Польшчы. Моладзь стала на падтрымку беларускай справы ў часы 2-й Сусьветнай вайны, моладзь працягнула змаганьне супраць расейскага балдышавізму ў пасьляваенныя часы. Моладзь дапамагла здабыць незалежнасьць у 1991 годзе. Наагул гэтая вялікая тэма, якая вымагае многіх паасобных разьдзелаў, і вартая цыклю гутарак.

Роля моладзі – вялікая. Калі яна з намі – Беларусь захавае незалежнасьць, здабудзе дэмакратычныя свабоды, адродзіць нацыянальную культуру".

Затым на сходзе адбыліся знаёмствы з гасьцямі аддзелу. На заканчэньні ўсе прысутныя мелі мажлівасьць яшчэ раз павіншаваць сп. Шукелойца, якому, дарэчы, неўзабаве спаўняецца 94 гады, і выпіць віна за яго і сп. Міцкевіча здароўе.

*Віталь ЗАЙКА*

Bielarus559c.qxd 7/31/2009 12:15 AM Page 9



# Ведайма сябе, або Беларуская нацыя ў люстэрку энеаграмы

*Зьміцер ДАВЫДЗЕНКА*

## 1. Некалькі словаў пра энеаграму

Сьцісла кажучы, энеаграма - гэта псыхалягічнае вучэньне, у аснове якога ляжыць тыпалёгія асобы паводле асноўнай глыбіннай матывацыі. Вядома, што яно ўзьнікла ў далёкай мінуўшчыне, сьляды яе вывучэньня й выкарыстаньня прасочваюцца ў хрысьціянстве, юдаізме, кабале, суфізме, у бабілонцаў ды антычных філёзафаў і матэматыкаў. Сымбаль энеаграмы быў знойдзены дасьледчыкам Г. І. Гурджыевым у суфійскім манастыры. У другой палове XX ст. навукоўцы на аснове старажытных ведаў зрабілі ў гэтай галіне новыя адкрыцьці й пераасэнсавалі гэтае вучэньне з улікам сучаснага навуковага досьведу. Зьявіліся розныя школы энеаграмы. Я знаёмы з той, якую стварылі амэрыканскія дасьледчыкі Дон Рыза й Рас Гадсан.

Само слова "энеаграма" паходзіць ад грэцкага ("энеа" – дзевяць, "грама" – мадэль). Гэтая тэорыя сьцьвярджае, што людзі падзяляюцца на дзевяць тыпаў паводле глыбіннай матывацыі, якая ўплывае на штодзённыя ўчынкі й сьветаўспрыманьне. Пры гэтым лепшых і горшых тыпаў няма. Прадстаўнік кожнага тыпу бывае на высокім і нізкім узроўні псыхалягічнага здароў'я. Недахопы кожнага тыпу – гэта ягоныя гіпэртрафаваныя вартасьці.

Паводле энеаграмы існуюць наступныя базавыя тыпы асобы:

1."Пэрфэкцыяністаў" (якія жорстка падпарадкоўваюць кожны свой учынак пэўным правілам, прынятых імі за стандарт, і патрабуюць таго-ж ад іншых);

2."Памочнікаў" (якія імкнуцца заслужыць любоў чалавека праз служэньне яму);

3."Канкурэнтаў" (для якіх усё жыцьцё - гэта спаборніцтва, дзе трэба ўсім паказаць, што ты - лепшы);

4."Індывідуалістаў" (якія адчуваюць сабе "асаблівымі", часта паглыбляюцца ў свае ўнутраныя эмоцыі й выказваюць свой складаны ўнутраны сусьвет праз творчыя дзеяньні);

5."Мысьляроў" (што любяць вывучаць "зьнешні" сьвет, назіраць і ствараць складаныя інтэлектуальныя канцэпцыі);

6."Ляялістаў" (якія бачаць сэнс жыцьця ў выкананьні пэўнай місіі й больш за ўсё клапоцяцца аб бясьпецы);

7."Авантурыстаў" (для якіх жыцьцё ёсьць ці павінна быць вялікім захапляльным фэстам);

8."Канфрантатараў" (што намагаюцца, каб жыцьцё ішло паводле іхных правілаў);

9."Міратворцаў", "рахманых людзей, якія найперш імкнуцца да адчуваньня спакою й гармоніі).

Схематычна энеаграма выяўляецца ў выглядзе кола зь дзевяцьцю кропкамі на акружыне на роўнай адлегласьці адна ад адной. Унутры кола гэтыя кропкі злучаныя паміж собой асаблівым чынам, ствараючы трохкутнік і няправільную гэксаграму, якія накладваюцца адзін на адну. Лініі паміж кропкамі адзначаюць сувязі паміж асобнымі энеатыпамі.

Энеаграма даводзіць, што ня толькі асобныя людзі, але й сацыяльныя аб'яднаньні, і нават нацыі, маюць свой характар, які адпавядае пэўнаму тыпу паводле энеаграмы. Нацыянальны тып у той ці іншай меры накладае адбітак на кожнага прадстаўніка нацыі. Ён моцна ўплывае на вэктар грамадзкага разьвіцьця. Дык ці ня варта ўлічваць ягоны чыньнік? Карыстаючыся энеаграмай, як аптычным прыборам, я паглядзеў праз яе на некаторыя нацыі, найперш на беларускую, і прыйшоў да высновы, што ў калектыўнай сьвядомасьці беларусаў моцна праяўляюцца якасьці энеатыпа "Міратворцы".

## 2. Чым адметны тып "Міратворцы"

Міратворцу коратка характэрызуюць як "сьціплы тып зь лёгкім характарам". Найбольш адметнай пазытыўнай асаблівасьцю тыпу міратворцы зьяўляецца здольнасьць наладжваць у адносінах між людзьмі гармонію й цалкам прымаць іншых. Яны лёгка ўспрымаюць навакольны сьвет і самыя імкнуцца зрабіць, каб іх існаваньне ў ім "нікому не замінала".

На высокім узроўні псыхалягічнага здароўя міратворцы простыя, шчырыя, сумленныя, гасьцінныя, поўныя даверу й любові да навакольнага сьвету. Гэтыя якасьці звычайна адзначаюць у беларусаў прадстаўнікі іншых народаў.

Міратворца лёгка бачыць і разумее пункты гледжаньня іншых. Для яго галоўнае – каб ўсе навокал адчувалі сябе добра, каб ён нікога не пакрыўдзіў, не навязаў свае інтарэсы. Менавіта таму нацыяналізм, ня кажучы ўжо пра нацыяналізм радыкальны, ніколі ня быў папулярным у шырокіх грамадзкіх колах Беларусі, ягоныя ідэалы цалкам падзяляе толькі невялікая частка насельніцтва.



Мадэль энеаргамы

Цісьнуць на міратворцу – справа няўдзячная: ён выглядае згодным і гатовым зьмяняцца і падпарадкоўвацца, але гэта ілюзорна. Гэтак вада расступаецца пад ціскам рукі, а варта забраць руку, як вада адразу займае сваё былое месца.

Звонку міратворцы выглядаюць рахманымі, жыцьцялюбівымі, дабразычлівымі людзьмі. Але часта, каб мець гэты вонкавы спакой, яны адмаўляюць сабе ў праве мець уласныя патрэбы й жаданьні. Яны ідэалізуюць, штодзённасьць, звычайнасьць, не жадаюць нечым выдзяляцца, імкнуцца мець просты побыт ды нізкія патрэбы. Менавіта па гэтай прычыне яны часта знаходзяцца "на заднім пляне", адмаўляюцца ад прызнаньня й пахвалы.

Адмаўленьне сваіх патрэбаў можа бесьсьвядома праяўляцца як жаданьне дасягнуць посьпеху за любы кошт, як жорсткія выбухі гневу ці як нешта гэтак-жа дэструктыўнае... Калі міратворца знаходзіцца ў стрэсе (адчувае моцны ціск звонку), ён пачынае скептычней ставіцца да матывацыі іншых. Адначасова яму ўсё цяжэй давяраць сваім уласным меркаваньням, і ён зашмат надае значэньня таму, "а што скажуць людзі?!".

Міратворца імкнецца радзей выказваць сваю думку, прыцягваць да сваёй асобы як мага менш ўвагі, праяўляе сябе толькі тады, калі яго аб тым папросяць. Яму цяжка некаму адмовіць, бо ён да такой ступені пазьбягае канфліктаў і "нэгатыву", што часам плаціць за гэта занадта шмат.

Міратворца адчувае, што ў ягоным жыцьці мала стабільнасьці й устойлівасьці й гатовы шмат зрабіць, каб яе знайсьці й захаваць. Таму ён пазьбягае сытуацый, калі можа пачуць дрэнныя навіны, падтрымлівае ілюзію балянсу. Лепш, лічыць ён, проста ня ведаць дрэннага. Ягоная сацыяльная роля – "спадар ніхто", ён "ніякі".

Але калі душа міратворцы знаходзіцца на здаровым узроўні, ён адчувае бясьпеку й гармонію, ён можа сканцэнтравацца на важных для яго мэтах. Ягоныя справы становяцца вельмі плённымі. Яму дапамагае ўнутраная стабільнасьць. Яго цяжка пакрыўдзіць, бо ён не прымае крыўду. Ён умее дасягаць сваёй мэты, пазьбягаючы перашкод, як вопытны лыжнік на слаламе. Гэтаму спрыяе тое, што ён добра разумее (не значыць, што прымае!) самыя розныя погляды.

Нездаровыя міратворцы лёгка губляюцца ў звычках і залежнасьцях, напрыклад, ад тэлебачаньня й алкаголю. Яны тонуць у трывіяльных занятках і забавах, забываюць пра свае ўласныя прыярытэты. Адчуваючы, што трэба зрабіць шмат, яны лёгка губляюць сувязь з тым, што сапраўды важна, губляюць адчуваньне напрамку й мэты, бясконца адкладваюць прыняцьце важных рашэньняў.

Нельга сказаць, што міратворца не адчувае гнеў. Яшчэ й як! Міратворца стрымлівае й падаўляе свой гнеў, як толькі можа. Ён старанна хавае й прыціскае яго, каб ягоны гнеў не быў заўважаны іншымі. Але адмаўляючы сабе ў праве на гнеў і нязгоду, ён гэтым самым адмаўляецца ад жыцьцёвай энэргіі.

Быкаўскі хрэстаматыйны вобраз Петрака (аповесьць "Знак бяды") – тыповы прыклад "міратоворцы". Нясьмелы, ціхі, далікатны, памяркоўны, ён спрабуе перачакаць і прыстасавацца. Ён імкнецца дагадзіць фашыстам паслухмянасьцю, улагодзіць самагонкай паліцэйскіх, існаваць з усімі ў гармоніі, нягледзячы ні на што. Справядліва лічыцца, што ў такіх паводзінах выяўляецца адна з рысаў псыхалёгіі "абы было ціха". Але з часам ягоны падаўлены гнеў, вядома-ж, вырываецца вонкі... Калі ён ужо ня можа яго кантраляваць і гіне.

## 3. Як тып «Міратворцы» праяўляецца ў беларусаў

Міратворца гатовы жыць паводле плянаў іншых, каб толькі любым коштам захаваць зь імі сувязь. Гэта часта праяўляецца ў адносінах беларусаў да Расеі і, у пэўнай ступені, да Эўразьвязу й ЗША. У зносінах зь імі міратворца часта адчувае сабе "малодшым братам". Ён не прызнае й не паважае сваю патрэбу ў тым, каб яго бачылі і цанілі.

Гэтую нацыянальную асаблівасьць, магчыма, адчуваў Янка Купала. Мяркую, калі ён пісаў: "*Занімай, Беларусь, дарагая мая, свой пачэсны пасад між народамі...*", калі зваў "з путаў на свабоду", ён меў на ўвазе, што зьмены патрэбныя ня толькі зьнешнія, але й унутраныя, найперш трэба, каб беларусы **самыя сябе адчувалі** роўнымі з іншымі народамі, а ня толькі фармальна былі прызнаныя ўсімі як роўныя.

А "Адвечная песьня" беларуса, ягоная адвечная скарга на цяжкую долю – ці ня вынік нацыянальнай мэнтальнасьці міратворцы? Ці ня гэтую мэнтальнасьць беларуса адчуваў Францішак Багушэвіч, калі зьвяртаўся да людзей са сваім жаданьнем "пагаварыць трохі пра нашу адвечную долю-нядолю".

У выніку ніхто ня лічыцца з іх інтарэсамі. Расейскі дыплямат Ю. М. Коласаў аднойчы прыгадаў выпадак, як у савецкія часы на паседжаньні Генэральнай асамблеі ААН галасаваньнем вырашалася пытаньне адной важнай рэзалюцыі. Між іншымі, удзельнічалі прадстаўнікі СССР і БССР, кожны з правам аднаго голасу. Старшыня падлічыў галасы і сказаў, што 50% за, 50% супраць, але ён мяркуе, што рэзалюцыю можна лічыць прынятай большынёй галасоў, бо прадстаўнік БССР, відавочна, памыліўся, калі прагаласаваў супраць: СССР прагаласаваў "за". І сапраўды, высьветлілася, што беларускі прадстаўнік проста не дагледзеў, як галасаваў прадстаўнік СССР. Ганебна й прыкра, але-ж ці ня варты паблажлівага стаўленьня да сабе той, хто нават не спрабуе выказваць ўласныя думкі?

Відавочна, для міратворцы важна адыйсьці ад ролі "гледача", быць актыўным, не баяцца браць на сябе адказнасьць за свой лёс.

В. Акудовіч неяк распавядаў пра адно сваё адкрыцьцё, якому ніяк ня мог даць задавальняючае тлумачэньне. Ён высьветліў, што ў аповедах пра час нямецкай акупацыі тыя беларусы, хто яе пражыў, звычайна канцэнтруюць сваю ўвагу не на жахах фашызму, а на тым пачуцьці стабільнасьці, якое стваралі немцы: напрыклад, як немцы змушалі трымаць у парадку падворак і рэгулярна падмятаць свой кавалак вуліцы. В. Ракіцкі, вядучы перадачы "Беларуская Атлянтыда" на Радыё "Свабода", таксама зазначаў, што ў народнай сьвядомасьці спаленыя вёскі, разбураныя гарады, панішчаная альбо вывезеная на чужыну моладзь апынуліся на другім пляне, а на першы выступілі і засталіся выдзелены акупацыйнымі ўладамі лес для ўдавы на адбудову згарэлай хаты, пакладзеная ў мястэчку брукаванка і гэтак далей.

На тыя-ж асаблівасьці беларусаў, якія, здаецца, цяжка растлумачыць, зьвяртае ўвагу аўтар аднаго з блогаў на сайце Радыё "Свабода": "*Жыхары Беларусі неаднойчы цягам мінулага стагодзьдзя зазнавалі масавае вынішчэньне. Як вядома, пачалося гэта ў часы г. зв.* "*яжоўшчыны*" *трыццатых гадоў, калі практычна поўнасьцю была вынішчана беларуская нацыянальная інтэлігенцыя. Крыху пазьней справу прадоўжылі немцы. А калі браць у разьлік гісторыю Беларусі 18—19 ст.ст. (*"*подзьвігі*" *Суворава і Мураўёва ў справе здушэньня паўстаньняў), то, здавалася-б, ужо на генэтычным узроўні, але затаіць зло на сваіх найбліжэйшых суседзяў беларусы павінны былі неадменна.*

*Але гэтага няма. Чаму? Адказ на гэтае пытаньне будзе адказам і на шмат якія іншыя* [...]. *Масавая сьвядомасьць беларусаў, як ніякай іншай сучаснай нацыі, адзначаецца неверагоднай цярпімасьцю, адсутнасьцю помсьлівасьці і той самай "талерантнасьцю", адно са значэньняў якой (у мэдыкаў) — такі імуналягічны стан арганізму, пры якім ён няздатны сынтэзаваць антыцелы.**"

---------------

* Унікальная талерантнасьць беларусаў // http://www.svaboda.org/content/article/1605721.html

*Заканчэньне ў наступным нумары*

Bielarus559c.qxd 7/31/2009 12:15 AM Page 2



# Шахматы для ўсіх

Гістарычны шахматны двубой абдудзеца ўвосень сёлета. Два былых чэмпіёны сьвету Анатоль Карпаў і Гары Каспараў ізноў сустрэнуцца за шахматнай дошкай. Матч прызначаны да 25-годзьдзя супрацьстаяньня двух геніяў сучасных шахмат. У 1984 годзе ў Маскве Карпаў і Каспараў упершыню гулялі за сусьветную шахматную карону. Той славуты паядынак цягнуўся доўгіх пяць месяцаў, але-ж так і ня выявіў пераможцу. Усяго тады было згуляна 48 партый. У пачатку матча да шасьці ачкоў Карпаў выйграў пяць партый, але так і не дацягнуў да перамогі. Каспараў, маладзейшы за Карпава на 12 год, здолеў пераламаць ход матчу і, выйграўшы тры партыі, здавалася, дабіваўся перамогі.

Але, нечакана, пры ліку 5-3 на карысьць Карпава прэзыдэнт Міжнароднай шахматнай фэдэрацыі шахмат таго часу Фларэнсіо Кампаманэс спыніў матч, спаслаўшыся на тое, што паядынак вельмі зацягнуўся і гэта можа дрэнна адбіцца на здароўі шахматыстаў. Каспараў быў вельмі незадаволены, але-ж вымушаны быў пагадзіцца. Толькі ў 1985 годзе быў аб'яўлены новы матч, які скончыўся перамогай Гары Каспарава 5-3.




Усяго 12-ы і 13-ы чэмпіёны сьвету згулялі разам пяць матчаў за сусьветную шахматную карону. Першы ніколі ня быў скончаны, другі і трэйці перамог Каспараў, чацьвёрты скончыўся ўнічыю, але па рэглямэнту Каспараў захаваў тытул чэмпіёна, у пятым ізноў перамог Каспараў. Цікава, што ва ўсіх гэтых паядынках Карпаў спачатку заўсёды быў наперадзе і саступаў толькі ўканцы.

Хто стане пераможцам сёлета, можна толькі гадаць. Цягам 15-ці гадоў Каспараў заставаўся мацнейшым шахматыстам плянэты і толькі ў 2000 годзе саступіў тытул чэмпіёна Ўладзіміру Крамніку. Нечакана для ўсіх у 2005 годзе Каспараў афіцыйна аб'явіў аб заканчэньні шахматнай кар'еры і з таго часу не згуляў у ніводным турніры. Карпаў, якому ўжо 58 год, і сёньня гуляе ў прафэсійныя шахматы і займае 98-ы радок у сьпісе мацнейшых шахматыстаў сьвету.

Матч Карпаў-Каспараў пройдзе сёлета з 21 па 24 верасьня ў Гішпаніі ў горадзе Валенсія. Некалькі кран супернічалі за права правесьці гэты гістарычны паядынак, але Гішпанія была выбрана нездарма, бо лічыцца радзімай сучасных шахмат. Менавіта ў Гішпаніі ў Валенсіі ў 15-м стагодзьдзі былі ўнесеныя істотныя зьмены ў правілы гульні, якія захаваліся да сёньняшніх дзён. Пра гэтыя зьмены чытайце ў наступным нумары.

Правільны адказ на задачку, пададзеную ў мінулым нумары:

1. d8 (С) Kph8
2. Cf6 мат ці

1. d8 (С) Kpf8
2. h8 (Ф) мат

Першым правільны адказ даслаў **Мікалай Цімашэнка**. Віншуем пераможцу і высылаем яму прыз – CD гурта "NRM". Таксама правільны адказ даслаў чытач з цікавым псэўданімам **Амаль Зусім**. Усім удзельнікам конкурсу шчыры дзякуй!

Чакаю ад вас лістоў на адрас у інтэрнэце: *palina_churun@yahoo.com* з адказам на новую двухходоўку: ход белых, мат у два хады.

***Паліна ЧУРУН***



# Чаму ў 1994 годзе перамог Лукашэнка?

*Заканчэньне з бачыны 1*

бода", рэдактарам якой быў сябра Апазыцыі БНФ і Сойму БНФ дэпутат Вярхоўнага Савету Ігар Гермянчук, выходзіла тады 100-тысячным накладам і адлюстроўвала апазыцыйную працу. Гэта было вельмі істотным. Да пачатку 1994 году ў выніку фронтаўскай растлумачальнай працы В. Кебіч ужо ня меў электаральных шансаў на выбарах.

**2.** Праца, праведзеная Фронтам, і антыкебічаўскі настрой электарату былі ўмела выкарыстаная КГБ, Масквой і іншымі сіламі, якія выставілі свайго кандыдата-тэрмінатара (Лукашэнку) і вымасьцілі яму дарогу да ўлады, выкарыстаўшы вялікія прапагандысцкія, агентурныя і фінансавыя рэсурсы.

**3.** Увесь цяжар афіцыйнай прапаганды і дзеяньняў (Кебіча) былі скіраваныя супраць БНФ.

**4.** Грамадзтва было падатнае на самы прымітыўны тэрмінатарскі папулізм, паколькі заставалася савецкім ва ўмовах крызісу. Самае істотнае, што людзі гэтага грамадзтва ня мелі прыватнай уласнасьці, а значыць – ня мелі жыцьцёвай патрэбнасьці свабоды і неабходнасьці яе абараняць. Чалавек без уласнасьці не пачуваецца гаспадаром на нацыянальнай тэрыторыі і слаба зьвязвае (альбо і не зьвязвае) сваё становішча зь лёсам нацыі і дзяржавы.

**5.** Перамога БНФ у гэтай сытуацыі забясьпечвалася-б у другім туры галасаваньня, паколькі вялікая колькасьць людзей галасавала за Лукашэнку, каб быць супраць Кебіча. Тым часам Лукашэнка ня меў ня толькі станоўчай праграмы, але і ўвогуле – ніякай праграмы, акрамя крайне папулісцкай крытыкі ў такт крызісным і рэтраспэктыўнам савецкім настроям. Стварэньне ў другім туры супрацьстаяньня Пазьняк-Лукашэнка істотна зьмяніла-б становішча. Тэрмінатарская крытыка тут ужо была-б незапатрабаваная, бо аб'екта электаральнага раздражненьня (Кебіча) ужо-б не было ў выбарах. Дзейнічаў-бы іншы выбар і іншы падзел электарату ў карысьць БНФ, які меў распрацаваныя моцныя праграмы дэмакратычнага і эканамічнага разьвіцьця Беларусі і гатовы ўрад, паказаны па тэлебачаньні (казалі, што група Лукашэнкі, убачыўшы гэта і пачуўшы, перажыла шок).

**6.** У другі тур галасаваньня, па падліках фронтаўскіх назіральнікаў (якія кантралявалі, практычна, усе выбарчыя ўчасткі), рэальна выйшлі Пазьняк і Лукашэнка. Але збоку ўлады былі задзейнічаныя адпаведныя рычагі "адміністрацыйнага рэсурсу", уплыву і падробкі. У выніку ў другі тур галасаваньня вывелі Кебіча, які ў рэальнасьці займаў чацьвертае месца. Гэтым было ўсё вырашана. Бо Кебіч ня меў шансаў супраць тэрмінатара – уся пратэстная энэргія выбаршчыкаў узбудзілася-б супраць Кебіча (што ў выніку і атрымалася).

**7.** Апошняя магчымасьць выправіць становішча і не дапусьціць антыбеларускія сілы і папулізм да ўлады была тады, калі Кебічу пасьля першага туру празь Сяргея Навумчыка было прапанавана зьняць сваю кандыдатуру. Па закону пасьля гэтага павінны былі адбыцца новыя выбары з новымі кандыдатамі. Кебіч не рашыўся на такі крок, бо яго акружэньне (якое ў сапраўднасьці таксама працавала на праект "Лукашэнка") пераканала яго, што ён пераможа.

**Высновы.** Такім чынам, нягледзячы на вельмі грунтоўна прапрацаваную апэрацыю ў КГБ і ў Лубянцы з выкарыстаньнем магутных прапагандысцкіх і агентурных рэсурсаў з шырокім і ўмелым захопам (на пратэстнай хвалі) часткі фронтаўскага электарату, у рэальнасьці не існавала, аднак, ніякай пэўнасьці ў перамозе Лукашэнкі на выбарах.

Галоўнай небясьпекай для рэжыму Кебіч і ўся намэнклятура лічылі Народны Фронт і яго кандыдата ў прэзыдэнты, і таму перад другім турам яны, фактычна, расчысьцілі дарогу Лукашэнку.

У сваіх нядаўніх успамінах Кебіч шчыра ў гэтым прызнаўся, кажучы, што агульнай перамогай яго і Лукашэнкі на выбарах стала тое, што яны выступілі як саюзьнікі і не дапусьцілі да ўлады Пазьняка. "Чей вклад в общую победу над кандидатами от БНФ, мой или Александра Лукашенко, оказался весомее, пусть рассудит время" ставіць усе кропкі над "і" Вячаслаў Кебіч. Як кажуць, лепей і ня скажаш.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

## Прыватныя абвесткі

Віншуем дарагую Марыю ДАНІЛЮК з юбілеем і жадаем надалей заставацца ўпрыгожаньнем беларускай грамады. Амэрыкі! Жадаем таксама мець моцнае здароўе, захавахаць свой аптымізм. Няхай Бог дасьць сілаў, энэргіі і доўгіх гадоў жыцьця Вам, а таксама Вашаму мужу Бырысу і ўсім Вашым сваякам.

Мы Вас вельмі любім і добра памятаем!

***Вашы сябры і прыхільнікі.***

## НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД "БЕЛАРУСА" АХВЯРАВАЛІ:

А. Кузьміцкая .............50

**Заміж кветак на магілу Алега МАХНЮКА:**

А. Орса-Романо ...........50

**Усім шчыры дзякуй!**

***Газэта "БЕЛАРУС" бясплатна надрукуе кароткія прыватныя паведамленьні й аб'явы некамэрцыйнага характару, віншаваньні, запрашэньні, спачуваньні ды інш.***

**БЕЛАРУС**
*Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце*
**Выдае штомесячна:**
***Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне***
**Сусьветнае сеціва: *baza-belarus.org***
**Падпіска $50 на год.**
**Чэкі выпісвайце на *BIELARUS***
**BIELARUS**
*Belarusan Newspaper in the Free World*
Published monthly by
***Belarusan American Ass'n, Inc.***
Subscription $50 yearly
Make checks payable to ***BIELARUS***
**Рэдагуе калегія.**
**Адказны рэдактар Марат КЛАКОЦКІ**
**Падпіска Сяргей ТРЫГУБОВІЧ**
**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам ці ініцыяламі, могуць зьмяшчаць пагляды, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.**
**Перадрук дазваляецца толькі пры ўмове зазначэньня крыніцы.**
© BIELARUS, 2009
**Адрас для дапісаў і кантактаў:**
***BIELARUS***
***P.O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
E-mail:
***hazetabielarus@att.net***
**Сусьветнае сеціва:**
***www.bielarus.org***
ISSN 1054-9455
**Адказнасьць за зьмест рэклямы нясе рэклямадаўца.**